Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 173 (28283)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Сем міфаў пра масаж**



**Як рэагаваць на дзіцячую рэўнасць**



**Чаму доктару важна ведаць мову?**

СТАР. 13

# Гронкі з-пад Гродна



Фота БЕЛТА.

Генадзь ГУЛЕВІЧ вырошчваннем вінаграду на сваім хутары ў Гродзенскім раёне займаецца ўжо 25 гадоў. Плошча вінаградніку на яго ўчастку за гэты час павялічылася да пяці сотак. У спрыяльны год з куста ўдаецца сабраць 4-5 кілаграмаў ягад. Сёлета ўраджай так сама не падвёў.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4 млрд 711,9 млн**

*у эквіваленце склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі ў жніўні ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду, павялічыўшыся за апошні месяц на $82,3 млн. Падтрыманню золатавалютных рэзерваў садзейнічалі паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў Беларусі і Нацыянальным банкам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама паступленні ад спагнання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9536 | ▼ |
| Еўра | 2,1962 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0731 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Харчовая бяспека

## БУДУЧЫНЯ — ЗА ДАКЛАДНЫМ ЗЕМЛЯРОБСТВАМ



**Галоўнай задачай айчынных навукоўцаў-аграрыяў цяпер становіцца атрыманне максімальна магчымага ўраджаю пры мінімуме выдаткаў. Менавіта дакладнае земляробства можа дазволіць скарацiць спажыванне паліва на 40 працэнтаў, гэтак жа зменшацца расходы ўгнаенняў, пестыцыдаў і іншых сродкаў, паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і вытворчасці Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ.**

СТАР. 4

■ Грошы

## НА РУКАХ ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ «СТАРАЯ» ДРОБЯЗЬ

**А самая буйная банкнота ў 500 рублёў у аддзяленнях банкаў пакуль не прапісалася**

**Яшчэ напярэдадні грандыёзнай фінансавай падзеі адзначалася, што праведзеная дэнамінацыя спросціць разлікі ў паўсядзённым жыцці як звычайных жыхароў краіны, так і тых, хто непасрэдна ў працы сутыкаецца з лічбамі. Нам паабяцалі, што ніякага павышанага ажыятажу наконт новых грошай не будзе. Што не ўзнікне цяжкасцяў і пры разліках у гандлёвых аб'ектах, дзе старыя і новыя цэннікі былі выстаўлены загадзя. З новымі грашыма мы жывём ужо больш за два месяцы і крыху да іх прывыклі. Таму цяпер паспрабуем спакойна адшукаць плюсы, а магчыма, і слабыя месцы хаджэння нашай валюты ў новым фармаце...**

### Даюць рэшту новымі, а тлумачаць у маштабе старых



На мой погляд, самае складанае для пакупнікоў сёння, гэта паралельнае абарачэнне розных нацыянальных купюр у гандлёвай сетцы. А вось з 1 студзеня 2017-га магазіны ўжо не будуць прымаць старых грошай, хоць абмяняць іх можна будзе па 31 снежня 2019 года ўключна ў Нацыянальным банку, банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Выбары-2016

# «ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА ПАРЛАМЕНТА — ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦАВАЦЬ»



**Ужо сёння кожнаму, хто вырашыць прыйсці на выбарчы ўчастак, належыць зрабіць выбар: за якога кандыдата ў дэпутаты аддаць голас? Калі падысці да гэтага асэнсавана, то перш за ўсё варта прааналізаваць, што станоўчага было зроблена мінулым кандыдатам не толькі для грамадзян, але, вядома ж, і ў заканадаўчым плане. Але як ацаніць эфектыўнасць такога боку дэпутацкай працы? Адказ на гэта пытанне дае Вадзім БАРАВІК, палітычны аналітык, старшыня назіральнага савета Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый.**

***— Якія існуюць крытэрыі эфектыўнасці заканадаўчай улады?***

— З пункту гледжання абывацеля, тыя ўзровень і якасць жыцця, што пануюць у краіне, з'яўляюцца асноўным крытэрыем улады ўвогуле: і заканадаўчай, і выканаўчай, і судовай. Наколькі чалавеку зручна жыць, наколькі ён задаволены сваім побытам, узроўнем жыцця, сацыяльнай сферай ды іншым. Звычайна людзі не асабліва адрозніваюць заканадаўчую ўладу ад выканаўчай і разумеюць іх у адным рэчышчы.

Калі казаць пра беларускі парламент, то асноўная яго пазітыўная рыса ў тым, што ён эфектыўна ўзаемадзейнічае з выканаўчай уладай. Але гэта не значыць, што ў парламенце няма дыскусій. У некаторых складваецца адчуванне, што паколькі ў нас не паказваюцца вострыя дэбаты па тэлебачанні, ніхто нікому не выдзірае валасы і за выступленне з трыбуны не змагаецца, то ў беларускім парламенце ўсё ціха і спакойна. На тым узроўні, дзе гэта патрэбна (у камісіях, падчас абмеркавання законапраектаў, важных для краіны), адбываецца дыскусія і абмеркаванне. Але можна працаваць над заканадаўчым актам, каб піярыць сябе, рабіць папулісцкія заявы, лозунгі, а можна дэталёва яго прапрацоўваць, каб пасля закон больш эфектыўна выкарыстоўваўся.

Вядома, што калі чалавек праводзіць пэўную працу, то да яго ўзнікаюць заўвагі. Мы бачым, напрыклад, што часам прымаецца нейкі закон, у яго ўносяцца змены, дапаўненні, затым ён укараняецца, і пасля наступае адваротная сувязь з прапановамі па дапрацоўках. Але гэта сістэма працуе ў любой краіне свету. Часам парламент крытыкуюць, што прымаецца так шмат паправак. Так, магчыма, іх павінна быць менш, значыць, неабходна яшчэ больш пільна падыходзіць да распрацоўкі законаў. Але сістэма «прынялі закон — прааналізавалі практыкапрымяненне — унеслі папраўкі» ўсё адно застанецца нязменнай.

Напрыклад, у нашай усходняй суседкі Украіны фінансавы год пачаўся, а бюджэт усё яшчэ не быў прыняты. Калі ў свеце і краіне крызіс, калі трэба пераадольваць эканамічныя нелады, рабіць крок наперад, пажадана, каб парламент працаваў эфектыўна, гэта значыць, папулісцка-палітычная барацьба павінна быць зведзена да мінімуму, каб сілы былі накіраваны на заканатворчую дзейнасць. З улікам усіх заўваг і аб'ектыўных нюансаў можна канстатаваць, што ў гэтым ракурсе наш парламент працуе добра. Сёння для краіны гэта важна, бо мы знаходзімся ў зоне геапалітычнага трохвугольніка.

***— Што вы маеце на ўвазе пад гэтым трохвугольнікам?***

— Беларусь займае стратэгічнае становішча з пункту гледжання геапалітыкі. На нас роўны ціск аказваюць і Усход, і Захад, мы знаходзімся ў сферы інтарэсаў іх абодвух. Заходні бок — гэта НАТА. Беларусь, у сілу свайго месцазнаходжання, — цэнтр еўрапейскай раўніны. Ніякіх натуральных перашкод з ваеннага пункту гледжання не маем, пры гэтым мы — сувязное звяно ў эканамічным, транспартна-лагістычным, транзітным, культурным, сацыяльным плане. Для Захаду тое, хто будзе адыгрываць больш значную ролю тут, жыццёва значны інтарэс. Тое ж самае і з боку Усходу — Расіі. У апошнія гады ў нас атрымліваецца праводзіць такую тонкую знешнюю палітыку, пры якой мы не толькі не ўмешваемся ў канфлікты, але і выступаем міратворцамі, і гэта высока ацэньваецца іншымі краінамі.

Пры гэтым сёння адчуваецца пік напружанасці паміж Усходам і Захадам. А Беларусь знаходзіцца пасярэдзіне. Таму ў гэтай сітуацыі нам важна захаваць спакой, стабільнасць, бяспеку на сваёй тэрыторыі. І нам палітычныя баталіі і не ў слушным плане актыўнасць парламента была б вельмі не да месца. Калі б у парламенце былі сваркі, не была б дакладна сфармулявана пазіцыя ў знешняй палітыцы, то мы мелі б вялікія праблемы. Бо адна з функцый парламента — дыпламатычная. Лінія, па якой працуюць Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі, супадаюць з асноўнай лініяй палітычнага кіраўніцтва краіны. І нам гэта на руку. Бо менавіта праз стабільнасць у парламенце і яго паступовую працу можна чакаць росту дабрабыту насельніцтва.

***— Як увогуле можаце ацаніць бягучыя выбары ў парламент?***

— Падчас сёлетняй кампаніі вядуцца дыскусіі, абмеркаванні, у тым ліку і ў сродках масавай інфармацыі. І гэта добра. Але не намі заўважана: чым цікавей навіны, перадачы, дыскусія ў парламенце, тым складанейшае жыццё ў краіне. Значыць, дзесьці крызіс: камусьці не выплацілі зарплату, хтосьці праз гэта выйшаў на забастоўку ці палітычныя сілы сутыкнуліся ў барацьбе. І тады трэба займацца вырашэннем не эканамічных праблем, а бягучых, набалелых.

Я прытрымліваюся таго, каб мы трансфармавалі і ажыўлялі жыццё ў парламенце па меры ўмацавання эканомікі краіны. Адной з прычын развалу Савецкага Саюза было тое, што Міхаіл Гарбачоў запусціў перш-наперш палітычныя рэформы, аслабіў цэнтральную ўладу і пры гэтым пачаў праводзіць эканамічныя рэформы, маючы дзіркі ў бюджэце і праблемы ў эканоміцы. Немагчыма гэтыя два пытанні вырашаць адначасова. Калі эканоміка не ў парадку, то залішні лібералізм у палітыцы толькі нашкодзіць. Ці будзе ў гэтым выпадку парламент працаваць сапраўды эфектыўна? Мяркую, што лібералізацыя палітычнага жыцця краіны, у тым ліку за кошт прысутнасці ў парламенце разнастайнай палітычнай публікі, павінна адбывацца паступова. Альтэрнатыўная думка павінна гучаць, але не заглушаць асноўную лінію. Бо трэба працаваць на вынік — ваенную і эканамічную бяспеку ды сацыяльную стабільнасць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## Звыш 32 000 нацыянальных назіральнікаў акрэдытаваліся на выбары

**Ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі будуць сачыць за парламенцкімі выбарамі больш за 5000 назіральнікаў. Сярод іх і Аляксандр ПІМЕНАЎ, які назірае за працай камісій Шклоўскай выбарчай акругі і ўчасткаў для галасавання №74, №75, №76 у Шклоўскім раёне.**

Альтэрнатыва ёсць, лічыць Аляксандр. У гэтым раёне на дэпутацкае крэсла прэтэндуюць чатыры кандыдаты: двое вылучаліся ад партый, двое шляхам збору подпісаў. Працэс агітацыі назіральнік ацэньвае так:

— Адзін з кандыдатаў сустракаўся з працоўнымі калектывамі. Гаварыў па справе, разумна ацэньваў сваю ролю ў парламенце. Мае рэальныя мэты і шляхі па іх дасягненні. Добра ведае правы, якія маюць дэпутаты. Агітацыі астатніх кандыдатаў я не бачыў. Хутчэй за ўсё, яны вырашылі абмежавацца выступленнямі ў тэле- і радыёэфіры і выпускам буклетаў.

Да таго ж я наведаў два пасяджэнні акруговай выбарчай камісіі. На першым абмяркоўвалі рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты, на другім — скаргу аднаго з прэтэндэнтаў на дэпутацкае крэсла. Члены камісіі працуюць высокапрафесійна. Пасяджэнні праходзілі адкрыта, у дэмакратычных умовах. Акрамя гэтага, я назіраў за апламбаваннем скрыняў 6 верасня, калі пачалося датэрміновае галасаванне. Усё праходзіла ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам.

Ужо больш за 32 000 нацыянальных назіральнікаў акрэдытаваны на выбары. Сярод іх крыху менш за 2000 накіраваны працоўнымі калектывамі, амаль 3500 грамадзян па заяве, больш за 3000 прадстаўнікоў партый і звыш 23 600 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ Інвестыцыі

# Новы драйвер росту для бізнесу

**У краіне запускаецца фонд прамых інвестыцый Zubr Capital Fund I (ZCFI) аб'ёмам 50 мільёнаў долараў. Асноўнымі інвестарамі фонду выступілі Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця і кампанія Wargaming. ZCFI будзе інвеставаць у тыя кампаніі, што хутка развіваюцца ў сектары інфармацыйных тэхналогій, вытворчасці тавараў народнага спажывання з высокім экспартным патэнцыялам, а таксама рознічнага гандлю.**




Падчас канферэнцыі ў прэс-цэнтры БЕЛТА **кіраўнік праекта па фандрайзінгу «Зубр Капітал» Мікалай ШАСТАК** выказаў думку, што запуск фонду паспрыяе прасоўванню і пазнавальнасці Беларусі за мяжой. Ён лічыць, што дзякуючы гэтаму праекту адкрыюцца новыя магчымасці для беларускіх кампаній. І прычым менавіта для тых, хто развіваецца хутка. У сферы інтарэсаў ZCFI — сектар інфармацыйных тэхналогій (IT-аўтсорсінг, IT-прадуктовыя кампаніі, гульні, інавацыі, e-commerce), вытворчасці тавараў народнага спажывання (прадукты харчавання, упакоўка, бытавая хімія, адзенне, мэбля, бытавыя паслугі, хуткае харчаванне і інш.), рознічны гандаль.

**Генеральны дырэктар кіруючай кампаніі фондамі прамых інвестыцый «Зубр Капітал» Алег ХУСАЕНАЎ** адзначыў, што сабраць 50 мільёнаў долараў было няпроста. Перад фондам цяпер стаіць новы выклік: знайсці, праінвеставаць і развіць ад 6 да 8 беларускіх кампаній.

Па словах **вядучага банкіра Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Аляксандра ЯЎСЕЙЧЫКА**, новы фонд стане важным гульцом на рынку прыватнага капіталу. Ён будзе аказваць падтрымку прыватнаму бізнесу ў Беларусі. Такім чынам, беларускія кампаніі атрымаюць больш шырокія магчымасці для фінансавання, а таксама асвояць сучасныя фінансавыя навыкі і тэхналогіі, неабходныя для паспяховай канкурэнцыі на ўнутраным і знешнім рынках. «Фондаў такога маштабу ў апошні час не стваралася, з фокусам менавіта на Беларусь. Да гэтага былі фонды расійскага, украінскага, заходняга паходжання, але сёння можна гаварыць пра тое, што інвестары зноў паверылі ў беларускую эканоміку і гатовыя інвеставаць у фонд, сфакусаваны толькі на Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Яўсейчык.

Стварэнне фонду прамых інвестыцый — гэта не толькі прыцягнутыя ў эканоміку краіны грошы, але і сучасныя фінансавыя тэхналогіі, што адкрывае вялікія перспектывы для ўсіх партнёраў. Менавіта таму Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця ўклаў 12,5 мільёна долараў у беларускі фонд прамых інвестыцый.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Пераемнасць і традыцыі

# МОЛАДЗЬ — У АВАНГАРДЗЕ ЖЫЦЦЯ

## Якія задачы яна ставіць на будучыню?

**«За час існавання Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі праз яго прайшло больш за 1,2 мільёна маладых людзей», — паведаміў на чарговым «Адкрытым дыялогу», прысвечаным у тым ліку і 14-годдзю з дня ўтварэння гэтага грамадскага аб'яднання, першы сакратар БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ. Зараз яно аб'ядноўвае ў сваіх радах каля пяцісот тысяч неабыякавых людзей, гатовых прыкласці свае сілы і здольнасці для таго, каб зрабіць больш цікавым, яркім, асэнсаваным сваё жыццё і жыццё сваіх равеснікаў.**

Напрыклад, гаворачы пра будучыя выбары, Андрэй Белякоў заўважыў, што ў парламенце павінны быць людзі, якія працуюць у першую чаргу на дабрабыт краіны. «Што тычыцца будучыні Беларусі праз 10-15 гадоў, то нам бы хацелася, каб тое, што цяпер ёсць у краіне, мы захавалі і памножылі», — сказаў першы сакратар. Каля 6,2 тысячы членаў БРСМ акрэдытаваны ў якасці назіральнікаў за ходам выбарчай кампаніі ў парламент.

Сустрэча стала своеасаблівым падвядзеннем вынікаў сёлетніх шматлікіх праектаў рэспубліканскага саюза моладзі; акрамя таго, на ёй сакратары Цэнтральнага камітэта аб'яднання агучылі планы на найбліжэйшую будучыню.

— На сёння ў студэнцкіх атрадах адпрацавала больш за пяцьдзясят тысяч чалавек, а ўсяго ў нас працоўнай дзейнасцю было ахоплена восемдзесят тысяч. Студатрадаўскі рух развіваецца не толькі колькасна, але і якасна. Даволі шырокае распаўсюджанне атрымаў наш новы напрамак — медыцынскія атрады. На ўсебеларускай маладзёжнай будоўлі таксама адбыліся змены. Яна пашырыла сваю геаграфію: летам да зводнага беларуска-расійскага будатрада далучыліся студэнты з Казахстана. Неабходна разумець, што студатрады — гэта не толькі рамантыка, заробак, гэта і дадатковыя працоўныя месцы, — расказаў **другі сакратар Цэнтральнага камітэта, каардынатар студатрадаўскага руху БРСМ, работы з працоўнай моладдзю, праектаў і праграм грамадзянска-патрыятычнага напрамку Сяргей КЛІШЭВІЧ.**

На яго думку, без матывацыі наймальнікаў немагчыма пайсці наперад. Сёлета ўпершыню будзе ўручаны пераходны сцяг найлепшай арганізацыі, якая прымае студэнцкія атрады, як сімвал захавання традыцый.

Валанцёрская дзейнасць БРСМ мае тры напрамкі: сацыяльны, экалагічны, спартыўны. За апошні год на новы ўзровень выйшаў праект «Аднаўленне святынь Беларусі», які дазволіў добраўпарадкаваць каля 240 культавых аб'ектаў.

— Калі раней мы супрацоўнічалі толькі з Беларускай Праваслаўнай Царквой, — адзначыла **сакратар ЦК ГА БРСМ Вікторыя МЯНАНАВА**, — то пачынаючы з гэтага года, праект закранае ўсе асноўныя існуючыя ў нашай краіне канфесіі.

**Ганна КУРАК**

■

■ Фінансавы выдатнік

# З ХВОРАЙ ГАЛАВЫ НА ЗДАРОВУЮ?

## Ніякага чорнага спіса крэдытаатрымальнікаў у Нацбанку не існуе

**Усё пачалося пасля таго, як у структуру галоўнага банка краіны пачала паступаць цэлая хваля зваротаў грамадзян. Яны скардзіліся на няякаснае прадастаўленне супрацоўнікамі камерцыйных банкаў інфармацыі, звязанай з адмовай у выдачы крэдыту. У сувязі з гэтым Нацыянальны банк рэкамендуе камбанкам даступна і аргументавана тлумачыць прычыны адмовы ў выдачы крэдыту. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным лісце Нацбанка камерцыйным банкам, размешчаным на сайце рэгулятара.**

Напрыклад, у дакуменце гаворыцца, што павінны рабіць банкі, калі яны адмаўляюць кліентам у заключэнні крэдытнага дагавора па падставах, прадугледжаных арт.141 Банкаўскага кодэкса (БК) Беларусі. Тут усё проста. Спецыялістам фінансавай установы неабходна даступна, аргументавана і кампетэнтна тлумачыць заяўнікам (крэдытаатрымальнікам) прычыны прыняцця адмоўнага рашэння.

А на самой справе ўсё адбываецца наадварот. Замест тлумачэння працэдуры і парадку прыняцця банкам адмоўнага рашэння, устаноўленых заканадаўствам і лакальнымі дакументамі банка, яго работнікі ў якасці прычыны адмовы робяць спасылку на неіснуючы пералік асоб, у дачыненні да якіх устаноўлена забарона на прадастаўленне крэдыту, які нібыта вядзецца Нацбанкам. Вось як яно атрымліваецца. Чытай паміж радкоў, што «мы тут усе добрыя, але ў Нацбанку вас у чорны спіс занеслі, таму і адмаўляем».

У сувязі з гэтым людзі і пачалі звяртацца па тлумачэнні ў Нацыянальны банк. «З улікам таго, што банкі самастойныя ў сваёй дзейнасці, лічым недапушчальным пры адмове ў прадастаўленні крэдыту спасылацца на Нацыянальны банк, тым самым уводзячы грамадзян у зман», — адзначылі спецыялісты рэгулятара. Больш за тое, фарміраванне ў насельніцтва не зусім правільнага разумення працэдуры прыняцця рашэння аб дачы крэдыту і выкарыстання інфармацыі з Крэдытнага рэгістра негатыўна ўплывае на рэпутацыю як Нацыянальнага банка, так і банкаў.

Акрамя таго, у прэс-службе нагадалі, што камбанк, які атрымаў крэдытную справаздачу кліента, абавязаны бязвыплатна даць чалавеку (па яго патрабаванні) гэты дакумент для азнаямлення. Калі ўсе агучаныя рэкамендацыі выконваць, то і праблем з пакрыўджанымі кліентамі не будзе. Аўтары вышэйназванага ліста ўпэўнены, што камерцыйныя банкі павінны вырашаць звязаныя з прадастаўленнем крэдытаў пытанні самастойна і накіроўваць у Нацбанк грамадзян толькі ў выпадках, калі апошнія ўпэўнены, што іх крэдытная гісторыя змяшчае недакладныя звесткі, а гэта патрабуе правядзення адпаведнай праверкі.

**Да ведама**

*У артыкуле 141 БК у прыватнасці гаворыцца, што крэдытадаўца мае права адмовіцца ад заключэння крэдытнага дагавора пры наяўнасці звестак аб тым, што прадастаўленая крэдытаатрымальніку сума крэдыту не будзе вернута (пагашана) у тэрмін, а таксама пры непрадастаўленні крэдытаатрымальнікам забеспячэння выканання абавязацельстваў па крэдытным дагаворы і пры наяўнасці іншых падстаў, здольных паўплываць на выкананне крэдытаатрымальнікам абавязацельстваў па крэдытным дагаворы.*

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Урокі гісторыі

# Каб не скажаць вынікі вайны

**Да 70-годдзя Міжнароднага ваеннага трыбунала ў Нюрнбергу генеральныя пракуроры краін СНД прынялі заяву**

**У жніўні 1945 года — праз тры месяцы пасля перамогі Савецкага Саюза над фашысцкай Германіяй — прадстаўнікі ўрадаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі заключылі пагадненне аб арганізацыі суда над галоўнымі ваеннымі злачынцамі. З 20 лістапада 1945 года па 1 кастрычніка 1946-га ў Міжнародным ваенным трыбунале праходзіў судовы працэс над экс-кіраўнікамі гітлераўскай Германіі, які назавуць Нюрнбергскім.**

Такога гісторыя дагэтуль не ведала. Перад трыбуналам паўсталі 24 ваенныя злачынцы, якія ўваходзілі ў вышэйшае кіраўніцтва фашысцкай Германіі. Усе 403 судовыя пасяджэнні былі адкрытымі. Яны шырока асвятляліся ў сродках масавай інфармацыі. Былі дапытаны сотні сведак, разгледжаны тысячы дакументаў. Падсудных прызналі вінаватымі ў цяжкіх злачынствах супраць свету і чалавецтва. 12 чалавек трыбунал прыгаварыў да найвышэйшага пакарання праз павешанне. Іншым было наканавана ўсё сваё астатняе жыццё або большую яго частку правесці за кратамі.

Да 70-годдзя Міжнароднага ваеннага трыбунала ў Нюрнбергу генеральныя пракуроры краін СНД, якія ў гэтыя дні падчас 26-га пасяджэння Каардынацыйнага савета сабраліся ў Мінску, прынялі адпаведную заяву. Неўзабаве яна будзе апублікавана на сайтах наглядных ведамстваў, а таксама Каардынацыйнага савета.

— Гэта, на наш погляд, пытанне стратэгічна важнае ў сусветным маштабе, — падкрэсліў **генеральны пракурор Расійскай Федэрацыі Юрый ЧАЙКА.** — Мы заклікаем не праводзіць пераацэнку каштоўнасцяў, не скажаць вынікі Вялікай Айчыннай вайны, не прапагандаваць нацызм і экстрэмізм.

Дарэчы, падобныя судовыя працэсы ў пасляваенны час прайшлі ў многіх гарадах Савецкага Саюза. 15 студзеня 1946 года ў беларускай сталіцы пачаўся адкрыты судовы працэс над нямецка-фашысцкімі акупантамі, які потым назавуць «мінскім нюрнбергам». За пасяджэннямі Ваеннага трыбунала, якія доўжыліся да 29 студзеня, назірала ледзь не ўся краіна. Каб папрысутнічаць падчас адкрытага судовага працэсу, грамадзяне адпрошваліся з працы, адкладвалі ўсе важныя справы. Перад трыбуналам паўсталі 18 генералаў і афіцэраў нямецкай арміі — непасрэдныя арганізатары і выканаўцы масавых злачынстваў на тэрыторыі акупаванай Беларусі. 14 з 18 асуджаных прыгаварылі да смяротнага пакарання.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

# УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У... БЕРАЗІНО!

Цудоўная ранняя восень з сонейкам і яшчэ па-летняму лагодным надвор'ем. Пачатак новай пары, а значыць, мы зноў выпраўляемся ў госці да сваіх чытачоў. Па добрай традыцыі кожны сезон распачынаем серыяй сустрэч з сябрамі «Звязды». Улетку аб'ехалі некалькі дзясяткаў раёнаў з усіх абласцей Беларусі, дык чаму не працягнуць прыемны і карысны шпацыр увосень?

Свае падарожжы цяпер мы распачынаем з цудоўнага куточка цэнтральнага рэгіёна краіны, Міншчыны, — Бярэзінскага раёна. Той, хто тут хоць аднойчы пабыў, упэўнены, заўжды будзе марыць зноў вярнуцца да найпрыгажэйшых краявідаў, да гасцінных і таленавітых людзей. Што, уласна кажучы, мы і робім. **Дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ўжо заўтра — 9 верасня — на раённым вузле паштовай сувязі з 11 да 14 гадзін.** У кожнага, хто сюды ў гэты час завітае, будзе цудоўная магчымасць падпісацца на любімую газету, пабачыцца са звяздоўцамі, а таксама атрымаць на добрую памяць арыгінальны падарунак ад нашага выдання. Як вам прапанова? Абавязкова прыходзьце — будзе цікава!

■ Кропкі над «і»

# ШКОЛЬНЫ СШЫТАК ЯК ЯБЛЫК РАЗЛАДУ

**Дзе на вокладцы трэба пісаць слова «Сшытак» — пасярэдзіне ці ў пачатку радка? Дзякуючы сацыяльным сеткам гэтае тэхнічнае пытанне ў першыя вераснёўскія дні раптам аказалася ў эпіцэнтры ўсеагульнай ўвагі.**




Раней слова «Сшытак» заўсёды пісалі пасярэдзіне радка. А цяпер настаўнікі вяртаюць вучням сшыткі, падпісаныя не па правілах, і не дазваляюць карыстацца прадукцыяй з надпісам «Сшытак» у цэнтры вокладкі, зробленым у друкарні. Бацькі абураюцца фармалізмам, які даходзіць да абсурду, а настаўнікі спасылаюцца на Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі. У дакуменце ў прыкладах афармлення слова «Сшытак» паўсюдна было размешчана злева ў самым пачатку радка.

І вось нарэшце Міністэрства адукацыі размясціла на сваім партале афіцыйнае тлумачэнне: «Пры афармленні надпісу на вокладцы сшытка варта прытрымлівацца ўзору ў адпаведнасці з дадаткам 1 да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснай і пісьмовай мовы ва ўстановах адукацыі.

Гэтыя рэкамендацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаны намеснікам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 6 чэрвеня 2016 г. і размешчаны на партале Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (edu.gov.by / Сістэма адукацыі / Агульная сярэдняя адукацыя / Да пачатку 2016/2017 навучальнага года).

Разам з тым указанні па надпісе на вокладцы сшытка носяць рэкамендацыйны характар. Такім чынам, слова «Сшытак» пры афармленні надпісу можа размяшчацца як у сярэдзіне радка, так і ў пачатку».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Дэбютны поспех

# ГУЛЬНЯ ПАД «БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ»

**Першы матч футбольнай зборнай у адборы на чэмпіянат свету 2018 года можна занесці ў залік. Прычым як футбалістам, так і заўзятарам. Вечар аўторка ператварыўся ў сапраўднае свята для ўсіх аматараў гульні нумар адзін у краіне. Не дзіва — дэбютавалі беларусы дамашняй гульнёй на «Барысаў-Арэне» з віцэ-чэмпіёнамі Еўропы французамі. Самы дарагі гулец свету Поль Пагба, сенсацыйны чэмпіён Англіі ў складзе «Лестара» Н'Гало Кантэ, лідар мадрыдскага «Атлетыка» Антуан Грызман — вось хто завітаў да нашых футбалістаў у госці. Вядома, зорная Францыя прыехала за трыма ачкамі, але ў залік занесла толькі адно.**



Фота: Прэс-служба АБФФ.

**Выдатная гульня галкіпера беларусаў Андрэя Гарбунова стала адным з вырашальных момантаў сустрэчы.**

Пачаць варта, відаць, не з самой гульні, а з таго, што ёй папярэднічала. Брэндаванне зборнай, ініцыяванае новым дырэктарам федэрацыі футбола па маркетынгу Уладзімірам Беражковым, вылілася ў стварэнне формы з нацыянальным арнаментам, з'яўленне сімвала «Белыя крылы», талісмана каманды «Ваяра» і цэлы шэраг цікавых акцый, якія дагэтуль беларускі футбол не бачыў. Чаго вартыя толькі адкрытая трэніроўка зборнай з продажам новай атрыбутыкі, а таксама перадматчавы перфоманс, падчас якога кожнаму, хто прыйшоў на стадыён, выдалі белую футболку з «крылатай» сімволікай. Нягледзячы на пэўны скептыцызм, праца дала плён — «Барысаў-Арэна» запоўнілася, што называецца, «пад завязку», прычым было відавочна, што заўзятары прыйшлі паглядзець менавіта «на сваіх», а не на сапернікаў, якія каштуюць дзясяткі мільёнаў еўра.

Можна ўпэўнена сказаць: такой падтрымкі на матчах зборнай не было вельмі даўно. Тысячы заўзятараў у белым з першай жа хвіліны шалёна падтрымлівалі сваіх любімцаў. І футбалісты аддзячылі выдатным першым таймам. За першыя 45 хвілін французы амаль нічога не здолелі стварыць каля варот Андрэя Гарбунова. А вось беларусы зрабілі некалькі перспектыўных вылазак у контратакі. Падчас адной з іх Цімафей Калачоў небяспечна прастрэльваў уздоўж лініі французскіх варот — Мікалаю Сігневічу і Міхаілу Гардзейчуку не хапіла лічаных сантыметраў, каб замкнуць гэту перадачу. Гэты момант і застаўся самым яркім у выкананні нашай зборнай.

На другі тайм падапечныя Аляксандра Хацкевіча выйшлі не менш зараджанымі на барацьбу і выдалі вельмі актыўную дзесяціхвілінку. Праўда, у небяспечныя эпізоды гэта не вылілася. А вось французы павольна забралі ініцыятыву да сябе і пачалі ствараць моманты. Самы небяспечны адбыўся пасля геніяльнай перадачы Антуана Грызмана пяткай на Аліўе Жыру, але нападаючы лонданскага «Арсенала» прабіў побач са штангай. Аднойчы беларусаў выручыла перакладзіна, некалькі фенаменальных «сэйваў» зрабіў Гарбуноў... Вынік — 0:0, вельмі добры пачатак адбору для беларусаў у гульні з фаварытамі групы. Але яшчэ больш парадавала стаўленне да зборнай заўзятараў — калі так працягнецца, дамашнія гульні будуць пакідаць у нашых сапернікаў толькі непрыемныя ўспаміны.

Ролю балельшчыкаў у добрым выніку сустрэчы адзначыў і **галоўны трэнер зборнай Беларусі Аляксандр ХАЦКЕВІЧ:**

— Безумоўна, выдатна, калі ўвесь стадыён у белым і каманда ў белым, — сказаў ён у пасляматчавым каментарыі беларускаму тэлебачанню. — Гэта быў наш дванаццаты гулец на працягу ўсяго матча. Панавала проста фантастычная атмасфера. Балельшчыкам трэба пакланіцца. І дай Бог, каб яны гэтак жа падтрымлівалі нас на працягу ўсяго адборачнага цыкла.

— Матч стаў для нас вялікім расчараваннем, — цытуе **паўабаронцу зборнай Францыі Н'Гало КАНТЭ** выданне L'Equipe. — У першым тайме мы сутыкнуліся з вельмі кампактнымі дзеяннямі беларусаў, яны шчыльна абараняліся. Сапернік паставіў нас у складанае становішча. У другім тайме было прасцей, мы правялі некалькі добрых атак. Але, на жаль, не змаглі забіць.

Наступную гульню ў кваліфікацыі чэмпіянату свету нашы футбалісты правядуць 7 кастрычніка ў гасцях са зборнай Нідэрландаў. А ўжо дзясятага чысла таго ж месяца Беларусь прыме на «Барысаў-Арэне» футбалістаў з Люксембурга. Пажадаем нашым хлопцам удачы і падтрымаем іх на стадыёне!

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# БУДУЧЫНЯ — ЗА ДАКЛАДНЫМ ЗЕМЛЯРОБСТВАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым спосабе прапануецца, напрыклад, мінімізаваць апрацоўку глебы на асобных землях. Узворванне можа быць заменена паверхневай апрацоўкай. Магчыма нават цалкам замяніць ворыва на тэхналогіі прамога пасеву, калі расліна высяваецца ў непадрыхтаваную глебу, але дзякуючы іншым тэхналогіям ураджай застаецца на стандартным узроўні.

«Гэта перспектыўны кірунак не толькі для Беларусі, ён актуальны па ўсім зямным шары, — падкрэсліў Дзмітрый Лужынскі. — Улічваючы адсутнасць у нашай краіне ўласных крыніц энергіі, гэта надзвычай важна».

Асобна можна памаўляць пра вытворчасць бульбы. Па інфармацыі **намесніка генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Вадзіма МАХАНЬКО**, нягледзячы на зніжэнне пасяўных плошчаў «другога хлеба», бульбы сёлета ў краіне «не шмат, а вельмі шмат». З улікам таго, што на асноўным рынку збыту — у Расіі — яе высадзілі больш, чым звычайна, кошты на беларускі прадукт пачалі падаць. Гэта прыводзіць да зніжэння рэнтабельнасці вытворчасці.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Беларуская чорна-пярэстая карова неўзабаве можа займець пароду-канкурэнта.**

«Цяпер убрана каля 11 працэнтаў пасадак, ураджайнасць у сярэднім на 3-5 кілаграмаў перавышае леташнюю, — расказаў Вадзім Маханько. — Рэкардсмен — Талачынскі раён, дзе збіраюць 41-42 тоны бульбы з гектара, гэта высокі нават па сусветных мерках паказчык».

Акрамя гэтага, спецыяліст паведаміў, што ў Беларусі распрацаваны рэгламент вакуумавання бульбы. Было даследавана 50 сартоў культуры, толькі два з іх прыдатныя да захавання без кансервантаў у вакуумнай упакоўцы. «Сёння ў многіх краінах Еўрасаюза гэта абавязковае патрабаванне для сферы грамадскага харчавання, — адзначыў спецыяліст. — Тое ж датычыцца многіх дзіцячых устаноў Расіі, таму, лічу, мы таксама павінны прыйсці да такога стандарту».

Цяпер у парламенце на разглядзе знаходзіцца Закон аб экалагічным земляробстве. Падобныя дакументы існуюць у многіх краінах, яны рэгламентуюць атрыманне экалагічна чыстай прадукцыі, у першую чаргу дзіцячага і здаровага харчавання, напрыклад бульбы, без ужывання мінеральных угнаенняў і хімічных сродкаў абароны. Па досведзе такіх краін, як ЗША, можна сказаць, што поўны пераход да экалагічнага земляробства прыводзіць да падаражання прадуктовага кошыка прыкладна ў пяць разоў. Таму экалагічна чыстая бульба будзе каштаваць вялікіх грошай.

Сур'ёзных поспехаў дасягнула айчынная жывёлагадоўля. Летась у краіне было выраблена 7 мільёнаў 450 тысяч тон малака. Гэтая лічба аналагічная паказчыкам 1990 года — найлепшага ў гісторыі краіны. Пры гэтым 25 гадоў таму пагалоўе кароў складала 2,5 мільёна галоў, цяпер — усяго 1,5 мільёна. Рост быў дасягнуты пераважна за кошт павышэння прадукцыйнасці. Усяго колькасць выпрацаванага малака на душу насельніцтва склала 760 кілаграмаў, па гэтым паказчыку Беларусь уваходзіць у дзясятку найлепшых краін свету. Па мясе ён складае 120 кілаграмаў на жыхара, гэта 12-я лічба ў свеце.

«Менавіта сфера жывёлагадоўлі з'яўляецца ключавой для нашай сельскай гаспадаркі, — адзначыў **першы намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Іван ШАЙКО**. — 95-96 працэнтаў экспарту прадукцыі сельскай гаспадаркі складаюць менавіта мяса і малако».

Такія поспехі толькі падштурхоўваюць айчынных навукоўцаў на новыя маштабныя праекты. Па словах Івана Шайко, дзякуючы інтэнсіўнаму выкарыстанню біятэхналогій, у Беларусі неўзабаве можа з'явіцца другая нацыянальная парода кароў. Цяпер у айчынных гаспадарках працуюць толькі з беларускай чорна-пярэстай, якая спалучае як высокія малочныя, так і мясныя якасці. Ужо ідзе праца па стварэнні беларускай галшцінскай пароды, якая будзе характарызавацца высокім паказчыкам вытворчасці малака — каля 11 тысяч кілаграмаў за лактацыю (у чорна-пярэстай ён складае каля 9 тысяч). Зацвердзіць новую пароду плануецца яшчэ да 2020 года.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# НА РУКАХ ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ «СТАРАЯ» ДРОБЯЗЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але вернемся ў другую палову 2016-га. Так здарылася, што мне ў крамах амаль заўсёды нават з новых грошай даюць дробную рэшту старымі. Больш за тое, пачынаючы тлумачыць гэтую аперацыю такім чынам, каб я трымаў у галаве маштаб старых цэн. Напрыклад, калі я даю прадаўцу за тавар коштам 4 рублі 23 капейкі прыгожую паперку ў 10 рублёў, то касірка аддае мне банкноту 5 рублёў і 7700 рублёў старымі. Пры гэтым яна абавязкова патлумачыць, што з вашых 100 тысяч рэшта будзе 57 тысяч 700 рублёў. Брр... Незразумела, навошта мне гэта, калі я бачу, што ў касе ёсць і капейкі. На гэты конт існуе стандартны адказ, што ёй так спакайней (так яна сябе кантралюе), да таго ж, часта людзі ад манет адмаўляюцца, а яшчэ — каб не было чэргаў.

З гэтымі тлумачэннямі я не згодны катэгарычна. Калі ў касе ёсць капейкі і металічныя рублі, то менавіта імі і трэба даваць рэшту. А мы, са свайго боку, павінны не прасіць касірку даваць нам рэшту банкнотамі ўзору 2000 года, а карыстацца выключна новымі грашыма, прывыкаць да іх, вывучаць, ведаць іх «у твар». Лепш ужо цяпер вучыцца планаваць свае пакупкі і сямейны бюджэт на месяц у маштабе новых грошай без нулёў. Насамрэч чатыры месяцы пройдуць амаль імгненна, а налета двайных цэннікаў у крамах ужо не будзе.

## І капейкі «хварэюць»?

Металічных грошай на прасторы нашай дзяржавы не было больш за 20 гадоў. Таму цяпер мы пачалі разглядаць іх сапраўды ўважліва. А некаторыя двухрублёвыя манеты аказаліся «з характарам». Пасля таго, як такія грошы пабывалі ў нашых вільготных далонях і сутыкнуліся з агрэсіўным асяроддзем (пот з'яўляецца слабай кіслатой), метал пачаў акісляцца. Калі «медныя» дробныя грошы пачалі проста цямнець, то менавіта двухрублёўкі мянялі свой колер не вельмі прыгожа. На асобных з іх пачалі з'яўляцца нейкія плямы, а часам нават яўная ржа.

**На мінулым тыдні банкноту з выявай Нацыянальнай бібліятэкі кліент абменьваў на долары. Аназаўтра па яе ў банк прыйшла жанчына, якая хацела мець на руках купюру менавіта гэтага наміналу.**

Мяне асабіста падобныя метамарфозы нашых манет не пужаюць, але існуюць індывідуумы, якія папсаваныя грошы брацьне хочуць. Адзін такі выпадак я назіраў у маршрутцы, а другі — на рынку. Што ў гэтым выпадку рабіць уладальнікам непрыгожых манет?

У прэс-службе Беларусбанка нам паведамілі, што ў любым аддзяленні гэтай фінансавай установы «кепскія» манеты без праблем (без нейкай камісіі) абмяняюць на новыя. Праўда, абмяняюць толькі пасля таго, як касірка ці іншы спецыяліст банка пераканаецца ў тым, што манеты не былі наўмысна пашкоджаны. Гэта можна выявіць візуальна ці нават з дапамогай спецыяльнай экспертызы.

А далей мы можам зрабіць высновы самастойна. Атрымліваецца, што калі нехта паспрабуе рабіць з манетамі доследы (змяшчаць іх у розныя растворы, біць малатком, плюшчыць, згінаць ці рабіць дзіркі), то потым камерцыйныя банкі такія грошы не прымуць. Магчыма, застанецца шанц аддаць гэтыя манеты ў Нацбанк, але адпаведнай інструкцыі на гэты конт рэгулятар пакуль не агучыў.

Тут будзе не лішнім нагадаць слушныя парады ад Нацбанка для тутэйшых кулібіных, якія любяць усё рабіць сваімі рукамі. Увогуле жартаваць з нацыянальнай валютай я не раіў бы нікому, бо гэта бокам можа выйсці. Выпадкі такія ўжо былі. Фальшыўкі рабіліся на звычайнай паперы і лёгка выяўляліся.

А яшчэ некалькі слоў пра сувенірныя грошы. У галоўным упраўленні наяўнага грашовага абарачэння Нацбанка нам паведамілі, што выраб выявы банкнот можа выконвацца на матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах. Але пры гэтым ёсць пэўныя ўмовы: пры аднабаковай выяве носьбіта памер копіі павінен складаць менш за 75% або больш за 125% ад рэальнага памеру банкнот. Пры двухбаковым выкананні — менш за 50% або больш за 200% ад арыгінала. А мы ведаем, што сапраўдная даўжыня 5-рублёвай банкноты ў нас складае 135 мм, 10-рублёвай — 139 мм, а 20-рублёвай — 143 мм. Калі дакладна ўяўляць сабе гэтыя памеры, то і праблем з «банкам прыколаў» у вас не будзе.



Асаблівa рукастых тавары- шаў спецыялісты Нацбанка папярэджваюць, што выкананне выявы манет можа рабіцца на любых матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах, за выключэннем сплаваў металаў. З пластмасы — калі ласка, можаце рабіць; пачаў капіраваць манету з металу — нажывеш непрыемнасці.

## Буйныя купюры не патрэбны, пакуль...

Яшчэ напярэдадні старту дэнамінацыі спецыялісты Нацбанка казалі, што банкноты наміналам 500 рублёў у банкаматы запраўляць не будуць, а заказаць іх можна будзе непасрэдна ў вашым банку. Так і адбылося. Цяпер банкаматы не запраўляюць купюрамі па 500 і 200 рублёў, ды і старублёўкі сустракаюцца не паўсюдна.

Работнікі камерцыйных банкаў паведамілі нам, што банкноты такіх наміналаў у спажыўцоў не вельмі папулярныя. Акрамя таго, банкі не рызыкуюць закладваць у аўтаматы самаабслугоўвання сапраўды буйныя сумы грошай.

Логіка банкіраў зразумелая, але прафесійную цікаўнасць у кішэню не схаваеш. Спачатку мы паспрабавалі заказаць 500 рублёў у адным з прыватных камерцыйных банкаў. Але там нам паведамілі, што такіх банкнот у іх няма і ў найбліжэйшы час не будзе.

**У прэс-службе Беларусбанка нам паведамілі: манеты абмяняюць на новыя толькі пасля таго, як касірка ці іншы спецыяліст банка пераканаецца ў тым, што грошы не былі наўмысна пашкоджаны.**

Спецыялісты Беларусбанка аказаліся больш адкрытымі для СМІ. Там у мяне адразу спыталі, на якую агульную суму мне трэба заказаць такіх банкнот. Тут аказалася, што адну банкноту асабіста для мяне работнікі аддзялення заказваць у Нацбанка не будуць. Пры гэтым паведамілі, што ўжо былі выпадкі заказу грошай гэтымі купюрамі асобнымі кампаніямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Яны заўсёды выконваюцца, але пры выкананні пэўных умоў. Увогуле, у банку паважаюць любых кліентаў, таму мне там параілі пакінуць свой нумар тэлефона і прозвішча. Калі ў касах аддзялення з'явіцца гэта сапраўды важкая купюра (яна адпавядае 250 доларам), то мне абавязкова патэлефануюць. Падобны выпадак у іх ужо быў на мінулым тыдні, калі банкноту з выявай Нацыянальнай бібліятэкі кліент абменьваў на долары. А назаўтра па яе ў банк прыйшла жанчына, якая хацела мець на руках купюру менавіта гэтага наміналу.

## Інфакіёскі спісваюць грошы толькі ў новым «вымярэнні»

Гэтую праблему мы ўжо агучвалі яшчэ ў ліпені, але нават і мае знаёмыя працягваюць наступаць на старыя граблі. Гаворка ідзе пра тое, што мы павінны індывідуальна перайсці на новы фармат грошай і навучыцца беспраблемна карыстацца паслугамі банкаўскіх прылад самаабслугоўвання, дзе ёсць нюансы...

Цяпер усе банкаматы, інфакіёскі і банкаўскія тэрміналы дзейнічаюць у сістэме новых грошай, дзе побач з рублямі прысутнічаюць ужо і капейкі. Пры аплаце тых ці іншых паслуг машына прапануе вам самастойна набраць неабходную суму ў асобным пустым радку. Праўда, цяпер гэты радок не зусім пусты, бо там узнікае стартавая лічба 0,00. Калі мы проста націснем на лічбу 5, то на экране з'явіцца 0,05, што адпавядае 5 новым капейкам. Такім чынам, для таго, каб кліент зняў з карт-рахунку, напрыклад, 500 рублёў, яму трэба на клавіятуры набраць лічбу 5 і плюс чатыры нулі. У гэтым выпадку 50 000 капеек машына аўтаматычна пераводзе ў рублі, калі на экране банкамата будзе 500,00. Такі ж алгарытм набору нам неабходна будзе выконваць пры аплаце «пластыкам» паслуг мабільных аператараў, камунальных і іншых паслуг у інфакіёсках. Калі за паслугу вам ужо выстаўлены пэўны цэннік, то ніякіх праблем не ўзнікае, бо застаецца толькі згадзіцца з машынай і заплаціць. Праблемы часцяком бываюць у тым выпадку, калі кліенту неабходна самастойна набіраць суму грошай на клавіятуры.

Тут я параіў бы ўжо цяпер дакладна сабе ўсвядоміць максімальную суму грошай, якую вы збіраецеся пакласці на тэлефон, за святло, газ і іншае. Усвядоміць менавіта ў новым фармаце грошай. У свой час мая дачка прасіла мяне пакласці на яе тэлефон 50 (тады яна мела на ўвазе 50 тысяч). Днямі чуў ад знаёмага, што той па аналогіі паклаў на свой смартфон 100 рублёў новымі, а гэта было на парадак больш ад запланаванага. Ён потым вярнуў сабе залішне аплачаныя грошы, але патраціў на гэта шмат часу і нерваў. Прыйшлося ездзіць у кампанію мабільнай сувязі, пісаць там заяву, а потым праз тыдзень атрымліваць грошы ў банку. Яшчэ складанейшы будзе алгарытм вяртання грошай, якія былі залішне выдаткаваныя на іншыя паслугі.

## Каля 10% купюр — у старым фармаце

Прэс-служба Нацыянальнага банка паведамляе, што прыкладна адна дзясятая частка старых грошай яшчэ застаецца на руках у насельніцтва. Спецыялісты патлумачылі, што Нацбанк выключыў са звароту каля 90% купюр старога ўзору ад сумы наяўных грошай, якія знаходзіцца па-за касамі нацыянальнага фінансавага рэгулятара. Калі ж глядзець па колькасці купюр, то вынята з абарачэння каля 50% старых грошай. Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка дадалі, што буйных банкнот (наміналам 50, 100 і 200 тысяч рублёў) на руках у насельніцтва практычна не засталося. У Нацбанку таксама выказалі здагадку, што выключыць усе купюры з абарачэння не атрымаецца. «Па суме гэты паказчык будзе блізкі да 100%, а вось па колькасці, хутчэй за ўсё, не, таму што дробныя купюры людзі захочуць пакінуць сабе ў якасці сувеніраў», — упэўнены эксперты галоўнага банка краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*



# ВЕРА Ў МУЖА

*«...Калі ты мяне кахаеш, у мяне вырастаюць крылы. Калі ты мяне кахаеш, аднекуль бяруцца сілы...»*

Гэтыя радкі, акуратненька выведзеныя почыркам мужа, на днях знайшла на месцы закладкі ў кнізе, што чытаю.

Гадоў 16 таму, калі я яшчэ нават не думала пра замужжа, мы з татам паехалі ў Браслаў, каб пракалоць мне вушы пад завушніцы. Пасля вырашылі адзначыць спаўненне дзіцячай мары тортам. Зайшлі па яго ў краму. І ў выніку прастаялі ў чарзе хвілін 10. Увесь гэты час за нашымі спінамі высвятляла адносіны сямейная пара. Дакладней, мужчына маўчаў, а жанчына бесперастанку пілікала яго: «Гэта ты ва ўсім вінаваты... Я ж табе казала, што трэба было...» Пасля таго як мы выйшлі з крамы, тата сказаў: «Глядзі, дачушка, не будзь такой, як тая жонка».

Памятаеце казку Ганса Хрысціяна Андэрсэна «Што мужанёк ні зробіць — усё добра»? Яна пра тое, як жонка адправіла свайго мужа на кірмаш, каб прадаць каня і купіць штосьці больш карыснае ў гаспадарцы.

Спачатку селянін памяняў каня на карову, затым карову — на авечку, авечку — на гуску, гуску — на курыцу, ну а курыцу — на мех з... гнілымі яблыкамі.

Перш чым вяртацца дадому, ён вырашыў зазірнуць у карчму, каб падсілкавацца. Слова за слова, разгаварыўся з мужыкамі: расказаў, як ён мяняў адно на другое, а ў выніку прыдбаў гнілыя яблыкі.

— Ды ты што! Твая жонка галаву з цябе здыме, — уступіў у размову багаты англічанін.

— Не, здыме, а абдыме! Яна мяне заўсёды хваліць, — усміхнуўся селянін.

— Калі жонка цябе пахваліць, то, слова даю, я табе замест гэтых яблыкаў цэлы мех золата насыплю.

Вярнуўся селянін дадому і пачаў расказваць жонцы, як ён памяняў каня на карову...

— Ах, які ж ты малайчына! Цяпер у нас сваё малачко будзе, і масла, і сыр, — абрадавалася жанчына.

— Ды ты ведаеш, я карову потым на авечку памяняў, — працягвае муж.

— Які ж ты разумнік! Заўсёды ведаеш, як лепей зрабіць! Авечку і дагледзець лягчэй, і карміць менш. А з воўны яе мы звяжам панчохі, а то і фуфайкі.

— Гэта праўда, але ж я авечку прамяняў на гуску.

— Няўжо ў нас і сапраўды будзе гусь да дня святога Марціна? Вось цудоўна прыдумаў!

— Ды я і гуску на курыцу абмяняў.

— Як добра, значыць цяпер у нас будуць яечкі і свае кураняты!

Тут муж паведаміў і пра гнілыя яблыкі.

— Не можа быць! Які ж ты малайчына! — сказала жонка радасна і моцна абняла мужа. — Калі ты паехаў, я надумала прыгатаваць табе смачны абед — яечню з цыбуляй. Яйкі ў мяне якраз ёсць, а цыбулі няма. Пайшла я тады да суседзяў: ведаю, цыбуля ў іх ёсць, але жонка ў суседа скваліпая-прыскваліпая, хоць і прыкідваецца добрай. Вось я і папрасіла ў яе пазычыць цыбулінку. «Цыбулінку? — перапытвае яна. — Ды ў нас у садзе нічагуткі не расце. Я вам і гнілога яблыка даць не магу». А вось зараз магу даць ёй цэлы дзясятак гнілых яблыкаў. Ды што дзясятак! Хоць увесь мяшок.

— Вось цуд дык цуд! — усклікнуў англічанін, які ў гэта час хаваўся за дзвярыма. — Як ёй ні цяжка даводзіцца, яна заўсёды ўсім задаволена. Для такой ніякіх грошай не шкада.

Напрыканцы XIX стагоддзя ў электрычную кампанію ў Дэтройце ўладкаваўся малады механік. Працаваў ён па 10 гадзін на суткі ўсяго за 11 долараў у тыдзень. А прыходзячы дадому, да паўночы шчыраваў у сябе ў адрыне, спрабуючы вынайсці новы тып рухавіка. Яго бацька, фермер, лічыў, што сын марнуе час, суседзі называлі мужчыну дзіваком — ніхто не верыў, што з гэтых заняткаў выйдзе штосьці-небудзь вартае. Ніхто, акрамя яго жонкі...

Зімой, калі рана цямнела, яна дапамагала каханаму працаваць, па некалькі гадзін трымаючы над яго галавой газніцу. Сінелі рукі, зубы стукалі ад холаду, але жанчына, нягледзячы ні на што, працягвала верыць у мужа!

Праз тры гады з адрыны пачуўся шум. Суседзі ўбачылі, як па дарозе ў калясцы, якая кацілася сама па сабе, без каня, ехалі дзівак і яго жонка. Дзівака звалі Генры Форд...

Калі журналісты пацікавіліся ў вынаходніка, які верыў у рэінкарнацыю, кім бы ён хацеў быць у іншым жыцці, пачулі ў адказ: «Кім заўгодна... Абы побач са мной была мая жонка».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *nadzieja@zviazda.by*


# Сямейная газета

Выпуск № 17 (60)


■ Першае фота

# «МЯНЕ НАТХНЯЮЦЬ МАЕ МАДЭЛІ»

## Фатограф Юлія Кухарэнка пра тое, наколькі гэта складана — здымаць немаўлят



Юлія Кухарэнка з сям'ёй.

**Некалькі гадоў таму Юлія Кухарэнка купіла прафесійны фотаапарат. Пасля былі заняткі на курсах і пошук «свайго» напрамку ў фатаграфіі. Зараз яна з усмешкай успамінае, як яе першымі мадэлямі былі кошкі, бо ні ў яе, ні ў знаёмых дзяцей тады яшчэ не было. Сёння Юлія здымае нованароджаных — тых, каму толькі-толькі споўніўся тыдзень. Сама мама, яна адчувае, наколькі важна захаваць на памяць самыя першыя моманты жыцця малыша.**

— З нараджэннем старэйшага сына Міхаіла ў мяне, як і ў многіх маладых матуль, з'явілася свая «мадэль». Я пачала шукаць сябе ў прафесійнай фатаграфіі: спрабавала розныя жанры — сямейныя, дзіцячыя, рэпартажныя здымкі, але не магла вызначыць, што на самай справе для мяне цікавей. Паўтара года таму мне пашчасціла пабываць на майстар-класе ўкраінскага фатографа дзяцей і нованароджаных Наталлі Гарбачэнкі, і я проста ўлюбілася ў гэты від фотаздымкі.

***— Што самае складанае ў такіх здымках?***

— Я заўсёды вельмі хвалююся, калі знаёмлюся з маленькімі мадэлямі. Гэта самы трапяткі момант для мяне.

Складаней за ўсё, напэўна, супакоіць бацькоў малога і настроіць іх на пазітыўны лад. Вельмі праўдзівае выказванне «спакойная мама — спакойнае дзіця». Здымкі заўсёды праходзяць лёгка, калі мы ўсе настроены на поспех. Таму я раю будучым бацькам яшчэ на этапе цяжарнасці, раз ужо яны адважыліся захаваць гэтыя дзівосныя імгненні першых дзён жыцця іх немаўляці, выбраць «свайго» фатографа і абмеркаваць з ім усе дэталі здымкі.


*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*


■ Насуперак стэрэатыпам

# 7 МІФАЎ ПРА МАСАЖ,

## або Пагладжванне ніхто не адмяняў

**Ці праўда, што можна пахудзець... лежачы? Ці патрэбен масаж усім без выключэння? Як адрозніць добрага масажыста ад дрэннага? Ці могуць бацькі самі рабіць масаж свайму немаўляці? Адказы на гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» знайшла на курсах «Асновы класічнага масажу» ў адукацыйным і кадравым цэнтры «Новае заўтра».**

### Міф 1. *Калі балюча, значыць масажыст добры*

Некаторыя пацыенты шчыра лічаць, што чым мацней ім мнуць цела — тым лепш. А пасля масажу (асабліва антыцэлюлітнага) абавязкова павінны заставацца сінякі — гэта паказчык эфектыўнасці працэдуры. Калі, маўляў, сінякоў няма, грошы выдаткаваныя дарэмна, масажыст нўмека ці слабак. Але гэта зусім не так. У добрага масажыста павінны быць адчувальныя рукі, а не вялікая сіла. Сіла яму наогул не патрэбна.

«БОЛЮ — «НЕ», СІНЯКАМ — «НЕ» — на першым жа занятку папрасіў запісаць вялікімі літарамі ў канспекце наш **выкладчык, масажыст з больш як 15-гадовым стажам Леанід ЧУРЫЛАЎ.** — Калі падчас працэдуры ваша самаадчуванне пагоршылася, з'явіўся боль, а на скуры — сінякі, раздражненне, рызыкаваць больш не варта. Вам проста не пашанцавала з масажыстам. Ёсць сярод калег і такія, якія з разумным выглядам будуць запэўніваць



вас: «Цярпіце, так трэба». Не трэба: ні болю, ні сінякоў пры любым масажы быць не павінна».


*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# 7 МІФАЎ ПРА МАСАЖ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

### Міф 2. *З дапамогай масажу можна пахудзець*

Сярод жанчын «лунае» яшчэ адна папулярная байка — пра тое, што масажам можна «раздушыць» альбо «падцягнуць» тлушч. «Насамрэч падцягнуць можна расслабленыя мышцы, але пры гэтым колькасць тлушчавых клетак у нас не зменшыцца, — развейвае чарговы міф Леанід Юр'евіч. — Хутчэй тут можна казаць пра аздараўленчы эфект антыцэлюлітнага масажу, які спрыяе нармалізацыі кровазвароту і лімфатоку, паляпшае абмен рэчываў у арганізме. У выніку за некалькі працэдур можна пахудзець кілаграма на паўтарадва. Аднак, калі вы не змеціце свайго ладу жыцця (не адмовіцеся ад салодкага, тлустага, вэнджанага, вострага і не пачнеце займацца спортам), уся праца будзе марнай. Памятайце, масаж — гэта толькі адзін са складнікаў у працэсе пахудзення».

### Міф 3. *Мама не можа рабіць масаж свайму дзіцяці*

Дзіцячы педыятр прызначае прайсці курс масажу амаль кожнаму дзіцяці да годзіка. Паколькі ў паліклініках вялікія чэргі, клапатлівыя мамы кідаюцца шукаць масажыста самі. Часта знаходзяць даволі сумніўных спецыялістаў. «Не рызыкуйце, — параіў нам (сярод курсантаў пераважная большасць — будучыя мамы) выкладчык. — Падыдзіце да выбару масажыста грунтоўна — давярайце сваю крывіначку толькі рукам прафесіянала. Памятайце, што лячэбны масаж — гэта не капрыз для задавальнення, а сур'ёзнае медыцынскае ўздзеянне. Разам з тым раю сам бацькам вывучыць некаторыя масажныя прыёмы. Псіхолагі лічаць, што масаж, зроблены блізкімі, часта дае большы эфект, чым масаж спецыяліста, бо няма пяшчотней дотыкаў мамы і таты. Адзінае, што тым бацькам, якія адважваюцца выконваць масаж дзіцяці самастойна, варта перш-наперш скончыць хоць бы мінімальныя курсы масажу, каб асвоіць тэхніку». Акрамя таго, што тычыцца дзетак, існуе шмат нюансаў. У прыватнасці, калі вы збіраецеся рабіць масаж немаўляці, ніколі не будзіце яго для гэтага. Пачакайце, пакуль дзіця само прачнецца. Нельга масіраваць, калі малое супраціўляецца і не ў захапленні ад працэдуры.

### *Міф 4. Усё залежыць ад чароўных крэмаў*

«Крэмам ды мазям у некаторых салонах прыгажосці прыпісваюцца ці не магічныя ўласцівасці. У сувязі з гэтым зусім абвясцэньваецца праца спецыялістаў: масажыст там, як бясплатны дадатак да цюбіка, — кажа Леанід Юр'евіч. — Калі шчыра, мяне як спецыяліста гэта раздражняе. Сюды ж можна аднесці міф пра антыцэлюлітныя крэмы. Гэта наогул поўная лухта. Рэдка які крэм пройдзе праз базальны пласт скуры. Антыцэлюлітны ж масаж дасягае свайго эфекту за кошт нармалізацыі гема- і лімфатоку. Галоўны інструмент масажыста ва ўсе часы — гэта рукі. Менавіта пры дапамозе асноўных прыёмаў масажу — пагладжвання, расцірання, размінання і вібрацыі — спецыяліст можа актывізаваць абмен рэчываў у арганізме, палегчыць боль, зняць напружанне ў цягліцах, палепшыць цыркуляцыю крыві і лімфы, разагрэць звязкі. І ў гэтым сэнсе масаж — важная частка лячэння многіх захворванняў». Замест «чароўных» крэмаў, састаў якіх часта надзвычай сумніўны, Леанід Чурылаў раіць выкарыстоўваць сумесі ўласнага прыгатавання, напрыклад аліўкавы алей з мёдам (карацей, усё, што можна ўжываць у ежу).

### Міф 5. *Добрага масажыста адрозніш толькі пасля ўсяго курса лячэння*

Сапраўды, тэрапеўтычны эфект можна ацаніць толькі праз 6 месяцаў. Але знешнія прыкметы прафесіянала можна адсачыць і да пачатку лячэння. Акрамя акуратнага вонкавага выгляду, дагледжаных рук (без ранак, завусеніц), у добрага масажыста павінен быць спецыяльны масажны стол. Прапануюць вам масаж на звычайным ложку будзе толькі малакваліфікаваны чалавек. Калі гэта, вядома, не масаж шыйна-каўняровай зоны, рук, галавы, якія можна рабіць седзячы.

**Псіхолагі лічаць, што масаж, зроблены бацькамі, часта дае большы эфект, чым масаж спецыяліста, бо няма пяшчотней дотыкаў мамы і таты.**

Падчас сеансу масажыст ніколі не стане агаляць вам усё цела. Калі масіруецца спіна, то ногі павінны быць накрытыя, і наадварот. Пра высокі ўзровень масажыста сведчыць тое, што ў яго ёсць методыка працы, калі адны рухі плаўна выцякаюць з іншых не толькі на адным сеансе, але і на працягу ўсяго курса масажу.

### Міф 6. *Масіраваць трэба толькі балючае месца*

«А ведаеце, як яшчэ можна адрозніць добрага масажыста ад дрэннага? — запытвае у нас выкладчык і тут жа сам адказвае: Дрэнны масажыст, калі вам баліць мезенец, пачынае масіраваць палец, а добры — спіну. У арганізме чалавека ўсё ўзаемазвязана, і часцяком прычына болю або хваробы крыецца не там, дзе баліць, а ў іншым месцы. У прыватнасці, бывае так, што пацыент скардзіцца на ногі, а праблема ў паясніцы. Боль здольны перамяшчацца па целе ў залежнасці ад размяшчэння ўшчэмленых нервовых карэньчыкаў або парушэння кровазвароту ў тым ці іншым участку». Таму, каб выбраць правільную тактыку лячэння і не нашкодзіць, важна ведаць анатомію і фізіялогію. Масажыст павінен разумець, што будзе адбывацца ў выніку яго дзеянняў, а не рабіць стандартны набор масажных прыёмаў, не разумеючы для чаго ўсё гэта.

### Міф 7. *Масаж патрэбен усім*

«Усім, за выключэннем тых, у каго ёсць супрацьпаказанні да масажу», — удакладніў Леанід Юр'евіч. — І калі ў вас не пытаюцца пра дыягназ, не аглядаюць вас перад тым, як пачаць рабіць масаж, — бяжыце».

Але ж калі я адпачывала на моры ў Егіпце і Балгарыі, то карысталася паслугамі пляжных масажыстаў. І ні разу ніводзін з іх не запытаўся, ці ёсць у мяне нейкія супрацьпаказанні. «Гэта сведчыць у першую чаргу пра тое, што для чалавека на першым месцы — зарабіць грошы, і не важна, якой цаной. З падобным падыходам вы можаце сустрэцца і ў буйных масажных салонах, SPA-цэнтрах. Таму раю не спадзявацца на сумленнасць масажыстаў, а перастрахавацца і запомніць пералік супрацьпаказанняў».

**Такім чынам, масаж (і нават самамасаж!) супрацьпаказаны, калі ў вас:**

1) варыкознае расшырэнне вен (Леанід Чурылаў: «Калі я бачу на нагах кліента варыкоз, ветліва адмаўляю, бо разумею, што сваім масажам магу справакаваць інсульт»);

2) захворванне шчытападобнай залозы;

3) вострая стадыя любога захворвання;

4) любыя пухліны, як злаякасныя, так і дабраякасныя (у тым ліку фібраміёма маткі ў жанчын);

5) міжпазваночныя грыжы;

6) розныя захворванні (альбо проста раздражненне) скуры (экзэмы, лішаі, гнайнікі, грыбок і г.д.);

7) любыя прастудныя захворванні або проста тэмпература цела, вышэйшая за 37,5°;

5) цяжарнасць (не рэкамендуецца, асабліва на ранніх тэрмінах);

6) менструацыя.

*...Мы адразу засмуціліся. Прыйшлі на курсы, каб вучыцца рабіць масаж, а тут столькі супрацьпаказанняў. Леанід Юр'евіч супакоіў нас. «Пагладжванне (адзін з абавязковых элементаў класічнага масажу) ніхто не адмяняў — яно не мае супрацьпаказанняў. Нават звычайны лёгкі дотык да далоні можа рабіць цуды: супакоіць арганізм, зняць стрэс... Пагладжванне рукамі ўплывае ў першую чаргу на нервовую сістэму, павышае ўзровень эндарфіну (гармону шчасця)». Дарэчы, Боб Хоўп (вядомы галівудскі акцёр, які зняўся ў фільме «Форэст Гамп»), пражыў больш за сто гадоў толькі таму, што, як ён сам казаў, кожны дзень рабіў масаж.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*






***Даражэнькія гаспадары і гаспадыні, вы, напэўна, ужо заўважылі, што «Хатняя энцыклапедыя» выходзіць цяпер на старонках «Сямейнай газеты». Але, пагадзіцеся, карысных парад шмат не бывае, таму «Хатнік» па-ранейшаму чакае ад вас лістоў з праверанымі часам сакрэтамі (па гаспадарцы, садзе, агародзе, майстэрні, машыне і інш.). Сёння ж сваімі ідэямі дзеліцца Вольга МАРКАВА з Віцебска.***

# ДУХМЯНЫЯ ІДЭІ ДЛЯ ДОМА

**Вядома, цяпер дастаткова розных цудадзейных чысцячых сродкаў, якія можна набыць у краме. Але я стараюся выкарыстоўваць «хіміі» як мага менш, да таго ж існуе шмат простых рэцэптаў для прыборкі дома з эфірнымі алеямі. Дзялюся толькі некалькімі, самымі эфектыўнымі, якія я прымяняю пастаянна.**



### Як адмыць і асвяжыць мікрахвалёўку за 3 хвіліны

Вазьміце ёмістасць з вадой, дабаўце туды 3—5 кропель эфірнага алею лімона ці мяты і пастаўце на максімальную магутнасць у мікрахвалёўку на 3 хвіліны. Вадзяная пара і алей размякчаць увесь засохлы бруд на грылі і сценках, і вам застанецца толькі працерці печку знутры мяккай губкай. Калі яна ў вас чыстая, можна выкарыстаць гэты спосаб проста для дэзынфекцыі і выдалення непрыемнага паху.

### Як пазбавіцца ад дрэнных пахаў на кухні

Я часта з'язджаю за горад і, здараецца, забываюся выкінуць смецце перад выхаднымі. Калі вяртаюся, на кухні, як вы здагадаліся, мяне сустракае, мякка кажучы, дрэнны пах. Для таго каб пазбегнуць яго, проста кладу на дно мяшка для смецця ватны шарык (ватны дыск таксама падыдзе), змочаны 1 кропляй эфірнага алею лімона і 1 кропляй эфірнага алею чайнага дрэва. Вось і ўсё. Спосаб на самай справе вельмі просты, але ён выдатна працуе.

### Правансальскі след ад пыласоса

Перад тым як пачаць пыласосіць, змочваю некалькімі кроплямі эфірнага алею лаванды кавалачак ваты і ўцягваю яго пыласосам. У выніку пяшчотны «правансальскі» водар у кватэры гарантаваны.

### Мыццё падлогі з эфірнымі алеямі

У ваду для мыцця падлогі заўсёды дадаю дзве сталовыя лыжкі марской солі і 5—8 кропель эфірнага алею чайнага дрэва (або эфірнага алею манарды, што таксама валодае магутным бактэрыцыдным дзеяннем). Марская соль нейтралізуе алергены і перашкаджае назапашванню пылу, а чайнае дрэва выдатна асвяжае паветра.

### Самаробны асвяжальнік паветра

У прыбіральні і ванным пакоі ў мяне ёсць палічкі, куды кладу аромакамяні (яны бываюць з гіпсу ці гліны: можна набыць, а можна і зрабіць уласнымі рукамі). Раз на тыдзень асвяжаю іх некалькімі кроплямі эфірнага алею лаванды, іланг-ілангу або хвоі. Гэтая простая працэдура напаўняе прыбіральню і ванную далікатным пахам.

### Апельсінавая лямпачка

Капаю на лямпачку апельсінавы алей, і пры ўключэнні святла яна награваецца. У выніку пакой напаўняецца прыемным водарам, які вельмі супакойвае перад сном.

*Спадзяюся, гэтыя практычныя парады дапамогуць вам падтрымліваць чысціню і парадак у доме з карысцю для здароўя, бо, насычаючы паветра малекуламі эфірнага алею, вы забіваеце бактэрыі і вірусы, якімі дыхаеце.*

**А вы карыстаецеся эфірнымі алеямі? Дзяліцеся сваім вопытам, парадамі і ідэямі.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# БЫЛО Ў БАЦЬКІ ПЯЦЬ СЫНОЎ

**Падставай для таго, каб даслаць гэтае фота на конкурс, стала маё знаёмства з Леанідам Валахановічам. Мой новы знаёмец, архітэктар па прафесіі, пры першай жа размове выказаў шкадаванне, што ў раённай кнізе «Памяць. Дзяржынскі раён» (а гэта зямля яго продкаў) ні слова не сказана пра сямейную дынастыю, якой ён па праве ганарыцца.**



**Браты Валахановічы — Валерыян *(стаіць злева)*, Сяргей і Віталь *(сядзіць)* — з бацькам Іванам Вікенцьевічам і сястрой Аляксандрай.**

Дзед Леаніда Валахановіча, Іван Вікенцьевіч, разам з жонкай выхавалі і выправілі ў самастойнае жыццё пяцёра сыноў і дачку. Ураджэнец вёскі Рудня былой Койданаўскай воласці, ён да Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў стрэлачнікам на чыгуначнай станцыі Негарэлае. Пасля смерці жонкі пераехаў у Маскву да сына Яўгена і пачаў працаваць на заводзе «Красный богатырь». Як сведчыць архіўная даведка ад 12 жніўня 1943 года, Івану Вікенцьевічу з улікам яго 70-гадовага ўзросту, а таксама той акалічнасці, што «пяцёра сыноў, якія маглі б матэрыяльна дапамагаць бацьку, знаходзяцца ў Чырвонай арміі», была прызначана льготная пенсія.

У хуткім часе пасля вызвалення Іван Вікенцьевіч вярнуўся на радзіму, да канца свайго жыцця жыў у Мінску, у дачкі Аляксандры. У дзевяцігадовым узросце яе ўзялі на выхаванне блізкія ленінградскія сваякі. У горадзе на Няве дзяўчына скончыла сярэднюю школу, паступіла ва ўніверсітэт на хімічны факультэт. Падчас блакады яна працавала санітаркай у бальніцы, а ў чэрвені 1942 года была эвакуявана ў горад Мелекес Ульянаўскай вобласці. У пасляваенныя гады вучылася ў Маскоўскім інстытуце тонкай хімічнай тэхналогіі, пасля заканчэння якога была накіравана ў Мінск. Працавала на пеніцылінавым заводзе, дзе да выхаду на пенсію была загадчыцай цэнтральнай заводскай лабараторыі.

Багатым на падзеі і працоўныя здзяйсненні склалася жыццё братоў Аляксандры. Старэйшы, Сяргей, скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і атрымаў накіраванне ў Народны камісарыят фінансаў, дзе працаваў да прызыву ў армію. Пасля дэмабілізацыі быў накіраваны на працу ў трэст металаапрацоўчай прамысловасці, адпрацаваў шэсць гадоў эканамістам. Працу сумяшчаў з вучобай на вячэрнім аддзяленні політэхнічнага інстытута. З дыпломам інжынера-механіка пачынае шчыраваць спачатку на станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава, пасля ў наркамаце мясцовай прамысловасці на пасадзе начальніка групы заводаў трэста. Будучы прызваным у армію ў чэрвені 1941 года, Сяргей Іванавіч служыў на адказных пасадах у бранятанкавых войсках. А ўжо ў мірны пасляваенны час працаваў у Савеце Міністраў БССР, з 1960 года — у Дзяржплане рэспублікі.

Дыплом Беларускага політэхнічнага інстытута атрымаў у даваенны час Валяр'ян Валахановіч. Да прызыву ў армію паспеў папрацаваць у інстытуце «Белпрампраект». З 1941 года да апошніх дзён вайны ён служыў у радах 13-й арміі, за баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны другой ступені. Пасля перамогі працаваў у названым праектным інстытуце, затым — у Савеце Міністраў БССР.

З армейскай службай звязана ўсё жыццё Віталя Валахановіча. Пасля заканчэння ў Ваеннай акадэміі хімічнай абароны на працягу 40 гадоў займаў высокія камандныя пасады ў розных рэгіёнах краіны. Пасля выхаду ў адстаўку ў званні палкоўніка працяглы час працаваў намеснікам дырэктара навукова-даследчага інстытута ў Маскве.

Двум з пяцярых братоў Валахановічаў не суджана было вярнуцца жывымі з вайны. Былы дырэктарам 374-й школы горада Масквы, Яўген Валахановіч стаў байцом народнага апалчэння і загінуў у лютым 1943 года на Арлоўшчыне. Брат яго Даніла ў перадваенны час вучыўся ў Ваеннай акадэміі сувязі. Стаўшы абаронцам радзімы, з 1942 года лічыўся без вестак прапаўшым. І толькі праз шмат гадоў стала вядома, што яго імя пазначана на пліце помніка на брацкай магіле ў Сергіева-Пасадскім раёне Падмаскоўя.

Гісторыя сям'і Івана Вікенцьевіча Валахановіча з'яўляецца яскравым пацвярджэннем таго, што маладое пакаленне нашых суайчыннікаў даваенных гадоў цалкам рэалізавала прадастаўленыя ім магчымасці з тым, каб зацвердзіць сябе і заняць дастойнае месца ў жыцці.

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Картачкі (не больш за тры) з невялічкай (!) гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца*** ■

■ Парады псіхолага

# ЯК РЭАГАВАЦЬ НА ДЗІЦЯЧУЮ РЭЎНАСЦЬ



**Дзіцячая рэўнасць — з'ява непажаданая, але непазбежная. Аднак бацькі могуць зрабіць даволі шмат для таго, каб гэтыя непрыемныя пачуцці прайшлі для брацікаў і сястрычак максімальна хутка і без наступстваў. Што канкрэтна — пра гэта пагаварылі з псіхолагам Аленай АРАНІНАЙ.**

— Часта рэўнасць узнікае тады, калі ў сям'і чакаецца папаўненне. Менавіта ў гэты перыяд дзіця адчувае недахоп эмацыйнай блізкасці з найдаражэйшым для яго чалавекам — мамай. Уявіце сітуацыю: маці прысвячала вам увесь свой час, а тут з'яўляецца нехта і забірае ад вас яе ўвагу і клопат. Гэта не можа выклікаць станоўчых пачуццяў.

Рэўнасць выяўляецца рознымі спосабамі. Напрыклад, у выглядзе гневу, агрэсіі. Дзіця можа біць маленькага брацка ці сястрычку, крычаць, ламаць рэчы. А бывае, што раўнівыя паводзіны накіроўваюцца супраць самога сябе. Каб мама звярнула на яго ўвагу, дзіця можа пачаць часта хварэць, горш вучыцца. Ці наадварот, рэзка палепшыць сваю вучобу.

***— Ці ёсць універсальныя правілы, якія дазваляюць згладзіць дзіцячую рэўнасць?***

— Дзецям абавязкова трэба бавіць час разам. Напрыклад, калі ў сям'і нараджаецца немаўля, рызыкоўна ў гэты момант аддаваць старэйшага ў садок. З пункту гледжання дзіцяці, мама аддае яго чужым людзям, а ўвесь свой час — малому. Гэта здольна выклікаць у старэйшага цяжкія, агрэсіўныя праявы рэўнасці. Можна пашукаць кампрамісныя варыянты: напрыклад, наведваць садок два-тры разы на тыдзень.

Вельмі часта ў сем'ях адсутнічае сумеснае баўленне часу. Паглядзіце, нават на дзіцячай пляцоўцы — адзін на арэлях гушкаецца, а другі ў пясочніцы гуляе. Трэба імкнуцца арганізоўваць сумесныя гульні, выхады ўсёй сям'ёй куды-небудзь. Скажам, мама можа са старэйшым кніжку чытаць, а на руках у яе ў гэты час сядзіць малодшае дзіця. Тата можа браць на шпацыр альбо ў краму ўсіх дзяцей, а не пакідаць кагосьці дома.

У той жа час удзяляйце індывідуальную ўвагу кожнаму дзіцяці. Прычым гэта выглядае не так, што мама робіць са старэйшым урокі, і гэта лічыцца, што яна бавіць з ім час. Прыдумайце штосьці, прыдатнае для старэйшага, каб ён адчуваў, што мама ўсё яшчэ ў яго распараджэнні.

***— Бывае, што старэйшае дзіця пачынае паводзіць сябе, як малое...***

— Вельмі важна паказваць дзіцяці, што вы разумееце яго пачуцці. Дапушчальна чатырохгадовага ўзяць на ручкі, пагушкаць яго. Маці не варта баяцца, калі старэйшае дзіця раптам просіць дапамагчы яму надзець штонікі, калготкі. У прынцыпе тут лепш падыграць, а не высмеяць. Калі вы пакажаце яму сваё разуменне, дзіця не будзе гэтым злоўжываць. У гэты момант яму сапраўды хочацца, каб яго абнялі, дапамаглі, апранулі, распранулі, гэта ўсё нармальна.

**«Гэта сумна, калі мама кажа: не чапай малога, ты яго ўпусціш, ты яго разбудзіш. У дзіцяці шчырая цікавасць да новага чалавечка, не трэба яе абмяжоўваць».**

Важна казаць дзіцяці, што вы яго любіце. Часта нам здаецца, што гэта і так зразумела. Я цябе нарадзіла, я пра цябе клапачуся, зразумела, што я цябе люблю. Але прагаварыце гэтыя словы ўголас, для дзяцей гэта важна. Я цябе люблю, я цябе цаню, я рада, што ты ёсць, — гэта тое, што дапаможа вашаму дзіцяці адчуць, што так, змены адбыліся ў яго жыцці, але любоў да яго засталася нязменнай.

Абавязкова прыцягвайце старэйшае дзіця да догляду малечы. Гэта сумна, калі мама кажа: не чапай малога, ты яго ўпусціш, ты яго разбудзіш. У дзіцяці шчырая цікавасць да новага чалавечка, не трэба яе абмяжоўваць. Лепш практыкаваць сумесны клопат за малечай: давай разам прыдумаем гульню яму, пальчыкі будзем размінаць, масаж зробім, я на адной ручцы, а ты на другой, пайшлі разам выберам цацку малому і табе.

***— Дарэчы, пра цацкі: менавіта яны найчасцей становяцца прычынай канфліктаў.***

— У старэйшага дзіцяці павінна быць свая асабістая прастора. Свае рэчы (калі дазваляюць умовы, то свой пакой), якія могуць выкарыстоўвацца толькі з яго згоды. Уявіце сабе, што нехта забраў у вас мабільны тэлефон на дзень! Вось і ў галаве дзіцяці не ўкладваецца, чаму ён павінен аддаваць свае цацкі? Тут, наколькі магчыма, трэба пазбягаць канфліктных сітуацый. Можна прапанаваць нейкую агульную гульню з цацкай разладу. Прычым дзецям трэба дапамагаць прыдумляць сумесныя гульні, а не проста сказаць: прыдумайце агульную гульню, а я пайшла. Яны могуць прыдумаць, а могуць і не прыдумаць. Больш эфектыўна будзе, калі мама падкажа дзецям, як разам можна пагуляць.

***— Калі ўсё ж такі праявы дзіцячай рэўнасці палохаюць бацькоў, што рабіць?***

— Калі ваша дзіця шчыкае малога, засоўвае нешта яму ў рот, то спакойна адвядзіце яго ўбок і патлумачце, што такія рэчы недапушчальныя. Важны момант: не кажыце, што такое недапушчальна менавіта ў дачыненні да маленькага. Падкрэсліце, што так нельга рабіць наогул з любым чалавекам.

Можна прагаварыць пачуцці дзіцяці, спытаць яго, што адчуваеш. Дзеці з трох-чатырох гадоў ужо могуць растлумачыць, што яны злуюцца, радуюцца, сумуюць. Калі малыя агучваюць свае пачуцці, ім становіцца лягчэй.

**«Калі ў сям'і нараджаецца немаўля, рызыкоўна ў гэты момант аддаваць старэйшага ў садок».**

Потым можна сказаць: я разумею, што ты злуешся, я цябе вельмі люблю, але давай ты больш не будзеш так рабіць. І тут уводзім тыя прыёмы, пра якія я казала раней. Сумесны клопат пра малечу, ідзіце гуляць разам з дзецьмі, а ўвечары ці калі малое заснула, кажыце старэйшаму: а цяпер я цалкам у тваім распараджэнні, таму што я цябе таксама вельмі люблю. І ідзіце з ім гарбатку піць ці пірог спячыце, кніжку пачытайце, галоўнае, што толькі з ім.

***— А ў выпадку, калі дзіця прыцягвае да сябе ўвагу праз добрую вучобу і дасягненні?***

— Бацькі тады звычайна кажуць: уф, добра, што са старэйшым пашанцавала. І аддаюць яшчэ больш увагі малодшаму. Атрымліваецца, што дзіця як ні старалася, а эфекту не дамаглося. Гэта таксама разбуральна для псіхікі.

Парады будуць тыя ж самыя, што і вышэй. Кажам, што любім, плюс сумесная дзейнасць, плюс час на само дзіця, плюс прагаворваем словы пра пачуцці. Я ганаруся табой, я вельмі рада за цябе, я абавязкова прыйду на тваё выступленне, на бацькоўскі сход, ну і прыйсці на гэты сход, вядома.

***— Якія памылкі звычайна дапускаюць бацькі, калі бачаць праявы рэўнасці ў сваіх дзяцей?***

— Вельмі вялікая памылка, калі бацькі караюць дзіця няўвагай. Раз ты так яго крыўдзіш, сядзі дома, а я пайду з малодшым гуляць у пясочніцу. Гэта самае страшнае пакаранне. Таму што дзіця раўнуе за няўвагу мамы да яго, а атрымліваецца, яго яшчэ больш караюць. Гэта павышае агрэсію, спрыяе назапашанню дзіцячай рэўнасці. Пакаранне можа быць розным — і пазбаўленне салодкага, і забарона на прагляд мульцікаў — але толькі не пакаранне няўвагай.

Бывае, што бацькі абмяжоўваюць узаемадзеянне дзяцей. Калі старэйшы раней адзін раз ушчыкнуў малога і зноў падыходзіць да ложка, то яму адразу крычаць, каб нават не набліжаўся. Не варта цалкам абмяжоўваць кантакты. Вядома, лепш прыглядаць за дзіцем, быць побач, але не крычаць, не забараняць. Можа, ён з чым добрым да яго прыйшоў, мірыцца напрыклад.

Калі вельмі сур'ёзныя памылкі былі зроблены, то дзеці ў дарослым узросце могуць проста не мець зносін. Яны ўжо не б'юцца, не крыўдзяць адно аднаго, а проста не размаўляюць. Іх адносіны, па сутнасці, разбурыла непрапрацаваная дзіцячая рэўнасць.

**Алена ХУРС** ■

# «МЯНЕ НАТХНЯЮЦЬ МАЕ МАДЭЛІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Які ўзрост найбольш падыходзіць для такой фотасесіі?***

— 5—14 дзён — найлепшы ўзрост для правядзення фотасесій з самымі маленькімі мадэлямі. Пасля трох тыдняў дзетак, бывае, непакоіць жывоцік, яны часцей плачуць або могуць адчуваць дыскамфорт, а гэта заўсёды перашкода здымкам, якія могуць доўжыцца ад трох да пяці гадзін. Акрамя гэтага, у першыя дні жыцця малыя добра спяць і іх можна пакласці ў любых дэкарацыях у тую позу, якая патрэбна. Зразумела, што дзіця павінна быць сытым і здаровым.

Часам бацькі самі просяць зрабіць некалькі фотаздымкаў з расплюшчанымі вочкамі. А бывае і так, што малы доўга адмаўляецца спаць. Я не лічу такія фота дрэннымі або няправільнымі, асабліва, калі гляджу на тое, што ў выніку атрымалася.

Абавязкова мы робім здымкі з бацькамі, старэйшымі брацікамі і сястрычкамі, а часам і з бабулямі і дзядулямі. Гэта вельмі кранальныя фота, якія будуць у далейшым цікавыя малому: якімі ж шчаслівымі былі яго блізкія, калі ён з'явіўся на свет!

***— Што выкарыстоўваеце ў якасці дэкарацый у кадры?***

— Падрыхтоўка да здымкаў вядзецца загадзя. Разам з бацькамі мы цалкам плануем увесь працэс і абмяркоўваем дэталі. Я цікаўлюся, якія колеры ім падабаюцца, прашу паказаць любімыя карцінкі з фотаздымкамі дзяцей (не абавязкова мае), каб лепш разумець, які вынік яны хочуць убачыць. Часам нешта трохі мяняецца падчас працы, дадаюцца новыя дэталі. Я стараюся не паўтараць свае вобразы, але часам бацькам хочацца, каб было менавіта так, «як на малюнку».

**З нараджэннем старэйшага сына Міхаіла ў мяне, як і ў многіх маладых матуль, з'явілася свая «мадэль».**

Універсальных колеравых спалучэнняў няма. Я стараюся максімальна ўлічваць пажаданні бацькоў. Хтосьці любіць спакойныя пастэльныя тоны, хтосьці — яркія і насычаныя, светлыя або цёмныя. У любым колеры можна стварыць свой унікальны і прыгожы вобраз.



5-14 дзён — найлепшы ўзрост для правядзення фотасесіі.



Здымкі з бацькамі заўсёды вельмі кранальныя.

Зараз у мяне ўжо вялікі выбар рэквізіту. Гэта і калекцыя тканін, якімі можна аформіць кадр, розныя павязкі і шапачкі, маленькія вязаныя цацкі, прыгожыя коўдры і пледы, кошыкі і скрыначкі. Гардэроб з вязаных рэчаў пастаянна абнаўляецца дзякуючы таленавітаму майстру Ганне Трафімавай.

***— Ці былі ў вас якія-небудзь здымкі, якія вельмі запомніліся?***

— Гэтым летам я ажыццявіла свае два даўнія жаданні. Я здымала дзве пары двайнятак. Гэта было цудоўна! Таксама я здзейсніла яшчэ адну сваю мару — здымкі немаўля на прыродзе.

***— Ведаю, што Беларускі саюз жанчын выпусціў каляндар з вашымі фота...***

— У мяне з'явілася ідэя стварыць каляндар з фотаздымкамі нованароджаных, якую падтрымаў Беларускі саюз жанчын, за што я вельмі ім удзячная. Сумесна з аўтаркай тэкстаў для гэтага календара Надзеяй Падрэз мы прыдумлялі вобразы, якія б атаясамляліся з месяцамі года. Цудоўна, што каляндар выйшаў на беларускай мове. У будучыні я спадзяюся на новыя цікавыя праекты.

***— Што вас як чалавека творчага натхняе?***

— У першую чаргу мае мадэлі. Для кожнага дзіцяці хочацца падабраць унікальны вобраз, які падыходзіў бы менавіта яму. Ідэі для новых фотасесій заўсёды зборныя. Іх можна знайсці ў прыродных фарбах, жывапісе, музыцы, падарожжах па розных гарадах і краінах.

**Ганна БАГІНО.**

Гэтым летам Юлія ажыццявіла сваю даўнюю мару — здымкі немаўля на прыродзе.



■ Магчымасці для беражлівасці

# ПРЫСМАКІ СА СЛОІЧКАЎ: ЗА І СУПРАЦЬ

**Найлепшая рэкамендацыя, каб перажыць эканамічна няпросты час, — скарачаць выдаткі. Але калі ў адносінах да сябе гэта можна зрабіць даволі лёгка, то ёсць катэгорыя «спажыўцоў», на якіх эканоміць зусім не рэкамендуецца, — гэта дзеці, асабліва маленькія. І ўсё ж, калі падысці разумна, дык і тут можна знайсці магчымасці для беражлівасці.**

Калі прыйшла пара ўводзіць прыкорм сыночку, я зразумела, што надыходзяць часы куды большых выдаткаў, чым у «чыста малочны» перыяд. Цэны на пюрэ з садавіны (100 г) пачыналіся ад 7 тысяч рублёў (на старыя грошы), на мяса-гароднінныя кансервы (200 г — дзённая норма) — ад 20 тысяч. А яшчэ ж былі патрэбны кашкі, сокі, тваражкі...

Як і належыць, прыкорм распачалі з гіпаалергеннай агародніны. Слоічак з брокалі малога не ўзрадаваў. Пюрэ мае такі спецыфічны смак, што паспытаць яго пагодзіцца не кожны дарослы. Не спадабаліся дзіцяці і квяцістая капуста, і іншыя кансервы са слоічкаў. Працэс прыкорму пайшоў толькі тады, калі я прыгатавала пюрэ сама з варанага гарбуза. Вось ён, саладкаваты і з прыемным водарам, якраз прыйшоўся сыну даспадобы. Затым да гарбуза далучыліся бульба, кабачок і мяса — трусяціна і нятлустая свініна. У выніку самы дарагі пункт праграмы прыкорму (мяса + гародніна) стаў для нас практычна бясплатным, паколькі гародніну і мяса перадавалі бабулі з вёскі.

Магчыма, і іншыя мамы эканомяць падобным чынам? Я пацікавілася і высветліла, што гэта так.

— Для малога я амаль усё гатую сама. Нават не з мэтай эканоміі, а па рэкамендацыі свайго педыятра, якая прынцыпова супраць слоічкаў. Які б натуральны састаў ні быў заяўлены на этыкетцы, усё роўна ў кансерваваным пюрэ будзе шмат розных бескарысных інгрэдыентаў, — гаворыць гамяльчанка Вольга Марозава.

Са «слоічкавых» прадуктаў Воля дае дзіцяці толькі пюрэ з садавіны, таму што свае — з яблыкаў, груш — яму не падабаюцца з-за кіслінкі. Агародніна для пюрэ — з лецішча: кабачок, гарбуз, бульба, зяленіва і г.д. У маразільніку пад «малышовыя нарыхтоўкі» адведзены спецыяльныя адсекі.

Сокі з пачкаў маладой мамай таксама не вітаюцца.

— У іх зашмат цукру, і наш стаматолаг гаворыць, што менавіта праз гэта «ляцяць» першыя зубкі, — тлумачыць Вольга. — Яшчэ здараюцца сітуацыі, калі дзіцяці неабходна піць шмат вады, напрыклад пры павышанай тэмпературы, а калі малы прывык да сокаў, ваду ён піць не стане.

Менавіта таму свайму сыночку мама дае морсы і кампоты, звараныя без цукру з яблыкаў, вішань, іншай садавіны і ягад.

Дыетычнае мяса — прадукт вельмі дарагі. Напрыклад, кілаграм індычкі каштуе ад 14 дэнамінаваных тысяч рублёў за кілаграм. І гандляры-гаспадары наўрад ці пагодзяцца прадаваць вам яе часткамі. А аддаць за індычку больш як 100 рублёў за адзін раз — такое не кожны сямейны бюджэт вытрымае. Але мамы знайшлі выйсце: яны купляюць мяса ў складчыну.

— У нас ёсць кампанія з трох мамачак. Мы «кааперыруемся» і разам купляем труса або індычку, потым дзелім. Прыгатаванае дома мясное пюрэ ў два разы танней, чым купленае ў краме, і, думаю, нашмат карысней, — дзеліцца вопытам Вольга Марозава.

Галіна Нітчанка з аграгарадка Урыцкае Гомельскага раёна таксама аддавала перавагу пюрэ, прыгатаваным уласнымі рукамі, пакуль дачка была зусім маленькай. Уся гародніна для дзіцяці бралася са сваіх градак; тое, што доўга не захоўваецца, клалі на замарозку.

— Карміць дзіця са слоічка, зразумела, зручней, але па грашах гэта даволі дорага. Да таго ж, калі гатуеш сама, дакладна ведаеш, якія прадукты выкарыстаны і што дзіцяці дастанецца самае найлепшае. «Слоічкавыя» кансервы мая дачка паспытала толькі ў дарозе, калі мы кудысьці ехалі. Увесь астатні час — хатняя ежа, — расказвае Галя.





**«У нас ёсць кампанія з трох мамачак. Мы «кааперыруемся» і разам купляем труса або індычку, потым дзелім. Прыгатаванае дома мясное пюрэ ў два разы танней, чым купленае ў краме».**

Дарэчы, для сваёй дзяўчынкі яна гатавала яшчэ і самаробныя тваражкі — спачатку простыя, а потым з садавінай. І тут ужо фактар эканоміі ролі не іграў — проста хацелася, каб дачушка ела самы свежы прадукт, без кансервантаў.

І яшчэ. Прыкорм «па-хатняму», у адрозненне ад «слоічкавага», трэба пастаянна гатаваць. Магчыма, не ва ўсіх мам хапае на гэта часу? Зусім не, мае знаёмыя «дэкрэтніцы» дружна заявілі, што прыгатаванне ежы для дзіцяці займае не больш за 40 хвілін. Пры гэтым паралельна можна рабіць іншыя справы...

Зрэшты, існуе і крыху іншы погляд на хатні прыкорм. **Намеснік галоўнага ўрача Гомельскай цэнтральнай гарадской дзіцячай паліклінікі, педыятр з 25-гадовым стажам Лілія ПАРФЕНЕНКА** раіць ставіцца да яго з асцярожнасцю.

— Дзіцячая дыеталогія пастаянна развіваецца, і гэта прымушае пераглядаць старыя схемы па арганізацыі харчавання дзяцей, асабліва першага года жыцця. Навуковыя даныя апошніх гадоў даказваюць перавагу якраз прамысловай вытворчасці, а не хатніх, — адзначае Лілія Анатолеўна. — Жадаем мы таго ці не, але пражываем мы з вамі ў зоне перыядычнага радыяцыйнага кантролю. Ягады, садавіна, агародніна вырошчваюцца на глебе, забруджанай радыенуклідамі, жывёла пасвіцца на такіх жа лугах. Не думаю, што кожны прадукт хатняй гаспадаркі праходзіць санітарную праверку. А дзіцячае харчаванне прамысловай вытворчасці вырабляюць з бяспечнай сыравіны, дзе адсутнічаюць цяжкія металы, пестыцыды, афлатаксіны, радыенукліды. Таксама думаю, не кожная мама дасканала ведае тэхналогію прыгатавання страў, а часта менавіта ад гэтага залежыць карыснасць і збалансаванасць прыгатаванай ежы для малыша. Даўно даказана, што недахоп або лішак тых або іншых харчовых рэчываў можа выклікаць парушэнне ДНК, прывесці да неспрыяльных змен у росце. Лічу, калі ёсць такая магчымасць, дзіця да 9-10 месяцаў жыцця лепш карміць харчаваннем прамысловай вытворчасці. А потым пашыраць меню малога хатнімі прадуктамі, і тут я цалкам згодна з вамі: гэта нашмат смачней і танней. Усім здароўя!

**Ірына ТРЫПУЗАВА,** *г. Гомель*

# Шчаслівыя разам. Увасьмярых!

**Часам лаўлю сябе на думцы, што прыходжу ў магазін не столькі па рэчы, колькі па атмасферу. Нядаўна, напрыклад, у маім доме адкрылася новая заакрама, дзе заўжды ветлівыя і чулыя кансультанты даюць парады, ад якіх майму гадаванцу становіцца жыць крыху лепш. І аднойчы, абмяркоўваючы з прадаўцом, чаму кошка не есць карысны і далёка не танны корм, пачула: «Мае сабакі яго ядуць...» І на пытанне, колькі іх, атрымала яшчэ больш нечаканы адказ: «Два сабакі, а яшчэ кошка, трусік і два пацукі». Для Валерыі ШЫЁНАК і яе мужа Дзмітрыя ўсе яны — сапраўдная сям'я. Калі ж мы адправіліся на шпацыр з сабакамі, то толькі і было чуваць: «Чаму не слухаешся тату? Не чапай маму!» А для Валерыі любоў да жывёл увогуле стала з цягам часу прафесіяй...**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**В.:** — Усё пачалося з хамякоў і галчаняці з падбітымі крыламі. У таты-рыбака пастаянна вугры плавалі ў ванне. Пасля, калі я вучылася ў першым класе, ён набыў сабаку са словамі: «Даглядаць яго не буду, самі займайцеся». А пасля гуляў з ім сам — і карміў, і даглядаў. У пятым класе я падабрала ката і прынесла яго дадому, дзе ён і застаўся. У дзявятым — з'явіўся пацук. Так і пайшло.

***— І гэтая любоў перайшла ў прафесію?***

**В.:** — Не зусім так. Бацькі хацелі, каб я паступала ў медыцынскі ўніверсітэт. Я — у ветэрынарную акадэмію. Але схадзіла на анатаміраванне няшчаснага сабакі на Дні адчыненых дзвярэй і зразумела, што ветэрынара з мяне не атрымаецца. У выніку стала біёлагам-аналітыкам, хоць па прафесіі так і не працавала. Але колькі сябе памятаю, любіла жывёл. І вось ужо тры гады я ў зоатаварах. Тут не патрэбна спецыяльная адукацыя: дастаткова стажыроўкі. Плюс час ад часу наведваем семінары. Але да нас пастаянна прыходзяць людзі, дзеляцца, раяцца, і мы імкнёмся даведацца больш, каб дапамагчы.

***— А як з'явілася сённяшняе «сямейства»?***

**В.:** — Пацукі былі заўжды, а калі мы сталі жыць разам з Дзімам, то вырашылі завесці сабаку. Вельмі хацелі лабрадора, але яны шмат каштуюць, таму праз інтэрнэт адшукалі меціса гэтай пароды бясплатна. Атрымалася што атрымалася *(смяецца і чухае сабаку за вухам)*. Ката падабрала, калі працавала ў іншай заакраме. Ён моцна чхаў тады. Адвезлі ў мінскую ветлячэбніцу на Мініна, дзе яго прапанавалі ўсыпіць. Тады ўкалолі яму антыбіётык, праз некалькі дзён кот апрытомнеў, і я папрасіла ў Дзімы, каб ён пажыў у нас трошкі...

**Д.:** — Гэта гучала як «Ён толькі пераначуе». І кот жыве з намі ўжо трэці год. Таксама ёсць трус. А пацукоў за гэты час было ўжо больш за дзесяць.

**В.:** — На жаль, яны доўга не жывуць.

**Д.:** — Я хачу тхара, а Лера — афрыканскага карлікавага вожыка.


Калі Валерыя пачала выносіць сваіх гадаванцаў на вуліцу, усе дзяўчынкі ў двары збегліся да яе. Але ў кадр трапіла толькі Марыйка, бо аказалася адзінай, хто не пайшоў рабіць прыгожую прычоску і апранаць лепшую сукенку для фотасесіі.

***— Вы, напэўна ж, і сышліся на любові да жывёл?***

**В.:** — Насамрэч мне вельмі пашчасціла з мужам. Бо ўсе жывёлы — гэта мая ініцыятыва. Гэта я прыводжу, цягну іх дадому. А муж цярпліва прымае ўсіх і дапамагае даглядаць.

***— Часта людзей спыняюць розныя прычыны, каб не заводзіць жывёл: няма часу, вялікая адказнасць, мала месца...***

**Д.:** — Месца ў нас сапраўды няшмат.

**В.:** — Калі пра ўсё гэта думаць, то не завядзеш нават хамяка. А калі любіш жывёл і лёс давярае табе клопат пра таго самага пацука (як прайсці міма?), то знаходзяцца і час, і месца, і сілы.

***— Ва ўсіх жывёл, мяркую, розныя характары. І ці ёсць яны ўвогуле?***

**В.:** — З усіх самы жвавы ў нас — трус Пячэнька. Ён можа любога паганяць, і ката перамагае, калі паб'юцца. Старэйшага сабаку мы называем «пацуковы пастух», бо ён абажае менавіта пацучкоў. А ўвогуле яны ў нас свабодныя. Дазваляем ім шмат, хаця, можа, і не варта. Сабакі і кошка спяць разам з намі на канапе ноччу, таму калі куплялі ложак, то шукалі самы вялікі.

**Д.:** — Усе жывуць мірна, бо ведаюць, што дзецца няма куды. І досыць хутка прызвычайваюцца адно да аднаго. Але сабакі, напрыклад, вельмі раўнуюць. Калі пачынаю гладзіць малодшага, то адразу прыходзіць лашчыцца старэйшы.

**В.:** — А яшчэ ў нас ёсць каманда «Будзі тату»! — калі сабакі заскокваюць на ложак і аблізваюць Дзіму з ног да галавы.

***— Увогуле, вы выхоўваеце іх, як дзяцей?***

**Д.:** — Так, не без гэтага. І ставімся мы да іх па-рознаму. Калі сабака нашкодзіць, то я магу і крыкнуць, і лёгкі пляскач даць. А Лера ў той жа час нават «фу» не скажа, а пачне тлумачыць, што «рулетку нельга грызці, бо яна дарагая». Гэта добрая нагода для канфлікту, але мы не паддаёмся. Дарэчы, часта людзі, калі з'яўляецца дзіця ў сям'і, у якой ужо ёсць жывёла, выкідваюць чатырохногіх на вуліцу. Навошта? Калі можна праз сацыяльныя сеткі размясціць аб'яву і аддаць у добрыя рукі.

***— Але гэтых аб'яў зараз зашмат.***

**В.:** — І ўсё ж такі яны працуюць. Мы калісьці адшукалі каробку з васьмю кацянятамі. І раздалі ўсіх! І праз інтэрнэт некалькі, і ў Ждановічах стаялі з надпісам «Аддадзім у добрыя рукі». Увогуле стаўленне да жывёл шмат што гаворыць пра чалавека.

***— Па вашых назіраннях, як звычайна да жывёл ставяцца беларусы?***

**В.:** — У большасці добра. Але ад астатніх жах бярэ... Бо догляд жывёл патрабуе сіл і грошай. Часта набываюць дарагіх ёркаў, а пасля кормяць іх самым танным кормам і лечаць самымі шкоднымі лекамі. Напрыклад, ЖЭСу прасцей замураваць падвал з катамі, чым дастаць іх адтуль і завесці ў прытулак, дзе іх, хутчэй за ўсё, усыпяць. Сапраўды, жывёлам у краіне не хапае абароненасці з боку дзяржавы. Тым не менш добрых, сумленных людзей больш, і гэта цешыць.

***— А каму пакідаеце жывёл, калі з'язджаеце ў адпачынак?***

**«Усе жывуць мірна, бо ведаюць, што дзецца няма куды. І досыць хутка прызвычайваюцца адно да аднаго».**


Пацукі былі рады магчымасці пабыць на свежым паветры і старанна пазіравалі. Чаго нельга сказаць пра ката, які ўпарта адмаўляўся ад здымкаў.

**В.:** — Сябрам. Яны жывуць непадалёк ад нашай кватэры. Прыходзяць кормяць усіх, сабак выгульваюць. Калі яны з'язджаюць, тое ж самае робім мы для іх сабак і кошак. Але ў адпачынак больш чым на тыдзень не ездзім.

**Д.:** — Насамрэч ёсць гасцініцы для жывёл. Але ўтрыманне ў іх абышлося б нам як яшчэ адзін адпачынак у Егіпце. На двух сабак і ката гэта каля 500 долараў.

***— Ці часта водзіце іх да ветэрынара?***

**В.:** — Па меры неабходнасці. Што можам, тое лечым самі, але не злоўжываем. Лепей лішні раз звадзіць да ветэрынара, чым нашкодзіць самалячэннем. Але і ўрача варта выбіраць з розумам. У дзяржаўнай клініцы можна сустрэць абыякавага доктара, які выпісвае самыя танныя, але шкодныя лекі. У прыватнай — параяць зрабіць дзясятак аналізаў, якія, магчыма, увогуле не патрэбны, але шмат каштуюць. Кажуць, што ў жанчыны павінны быць два «уласныя» дактары: стаматолаг і гінеколаг. Як па мне — тры. Яшчэ і ветэрынар. *(Смяецца.)*

***— Калі ласка, можаце даць параду тым, хто выбірае чатырохногага сябра, асабліва для дзяцей?***

**В.:** — Галоўнае, каб дарослыя разумелі, што займацца жывёлінай будуць менавіта яны. Прыходзіць неяк да нас маці з трохгадовай дачкой. Маці запытвае: «Колькі жыве хамячок?» — «Паўтара-два гады». «Так доўга! Лепей бы яго хутчэй не стала». Вось пры такім адказе лепей нікога не набываць. Хоць калі гадаванец узяты свядома, то з яго дапамогай можна прывіць адказнасць дзіцяці: вучыць прыбіраць, карміць, даглядаць. Нельга забывацца, што, калі бярэш жывёлу, у цябе становіцца на адно дзіця больш...

**Веранiка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Ёсць пытанне

# ШТО РАБІЦЬ З ПТУШАНЁМ?

**З такім пытаннем звярнулася ў рэдакцыю чытачка з Віцебска. Яе знаёмая знайшла на трасе драпежнае птушаня.**

— З падобнымі пытаннямі мне часта тэлефануюць людзі, — кажа **арнітолаг Уладзімір ІВАНОЎСКІ.** — Вось нядаўна гараджане знайшлі каля чыгункі на ўскраіне Віцебска вушастую саву і дамавога сыча. А адна сям'я на дарозе ў Гарадоцкім раёне ўбачыла бяспёрага сокала чаглока.

Выпадак, можна сказаць, унікальны — каб на трасе... Ён яшчэ ў пуху — зусім маленькі. Самая правільная здагадка: птушаня там апынулася пасля ўрагану, які паваліў дрэвы, дзе знаходзілася гняздо. Прывезлі яго ў горад і мне тэлефанавалі. Тлумачыў, што ўжо праз два тыдні драпежная птушка, якая пабывала ў руках чалавека, не зможа жыць на волі, як раней. І нават калі яна вонкава не будзе адрознівацца ад сабратаў (пад апярэннем не відаць, што адстае ў развіцці), фізічна будзе рахітам. Кармленне мясам з рук не заменіць паўнавартаснага збалансаванага харчавання, якое забяспечылі б ёй бацькі. Таму трэба як мага хутчэй вярнуць птушаня «на прыроду».

Ніколі не цягніце дадому нетраўмаваных птушанят. Тую ж вушастую саву можна пасадзіць назад у гняздо або проста на галінку, бо на зямлі ёй пагражаюць лісіцы ці сабакі... Залезце на дрэва, метры на 3-4, зрабіце імправізаваны насціл з галінак. Згаладалае птушаня пачне гарлапаніць. І бацькі яго пачуюць і будуць карміць.

Дарэчы, і прыродаахоўнае заканадаўства забараняе забіраць з прыроды здаровых жывёл.

— Іншая справа, калі птушачка параненая, — дадае арнітолаг. — Такую, калі ўжо прывезлі ў горад, давядзецца карміць усё жыццё. Тут актуальная думка класіка пра тое, што мы ў адказе за тых, каго прыручылі. Ведаю чуллівую сям'ю, якая «ўсынавіла» птушаня чаглока. Яшчэ ў адных жыў у кватэры асаед, а ў іншых — вераб'іны сыч. Або можна прапанаваць знаходку заапарку.


Вушастая сава.
Фота Уладзіміра ІВАНОЎСКАГА.


Чаглок.

Дарэчы, у віцебскім заапарку ўжо чвэрць стагоддзя жыве арлан-белахвост. Яго перадаў туды Уладзімір Іваноўскі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 7** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 401/С-22668 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 182,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Луговая, 77А |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422050400002002477, площадью 0,0474 га (назначение – для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Луговая, 77А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2 |
| **Начальная цена продажи** | 16 320 р. (шестнадцать тысяч триста двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 632 р. (одна тысяча шестьсот тридцать два рубля) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 сентября 2016 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первых торгов было размещено в газете «Звязда» от 01.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 13 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2 |
| **Начальная цена продажи** | 40 951 р. (сорок тысяч девятьсот пятьдесят один рубль) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 095 р. (четыре тысячи девяносто пять рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 20 сентября 2016 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 14 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Семена трав (клевер красный), 1500 кг. Начальная стоимость лота — 3,08 белорусского рубля за 1 кг. Лот № 2. Семена трав (тимофеевка), 1500 кг. Начальная стоимость лота — 2,67 белорусского рубля за 1 кг** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ГП «Гнездилово-Агро», УНП 300014076, юридический адрес: Витебская область, Докшицкий район, д. Гнездилово, ул. Советская, 2 |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, Докшицкий район, д. Гнездилово, ул. Советская, 2 Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Комзаков Иван Александрович – директор ГП «Гнездилово-Агро», тел.: 8 029 350-18-26 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 **10 октября 2016 года в 12.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витоблисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 7 октября 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Автомобиль УАЗ 390945 330, 2010 г.в., гос. номер АЕ 2827-2. Начальная стоимость лота — 5873 белорусских рубля. Лот № 2. Автомобиль ВАЗ 21214 126-20, 2006 г.в., гос. номер 7862 АР-2 Начальная стоимость лота – 1097 белорусских рублей. Лот № 3. Автомобиль ВАЗ 21213, 2010 г.в., гос. номер 2781 АВ-2. Начальная стоимость лота – 450 белорусских рублей. Лот № 4. Автомобиль ВАЗ 21214, 2010 г.в., гос. номер 4577 ВР-2. Начальная стоимость лота – 4117 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Ольшанка», УНП 300060118, юридический адрес: Витебская область, Браславский район, аг. Плюссы |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, Браславский район, аг. Плюсы. Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Богородь Павел Витольдович – директор ОАО «Ольшанка». Тел.: 802153 60455 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 **10 октября 2016 года в 10.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витоблисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 7 октября 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

**12 октября 2016 г.** **№9-С/2016**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб./коп. | Сумма задатка, руб./коп. | Затраты на подготовку документации, руб./коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Ясная (между усадебными жилыми домами №56 и №60) | 340100000004001368 | 0,0771 | Охранные зоны линий связи и радиофикации | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 11 720 р. 99 коп. (117 209 887 р.) | 586 р. 05 коп. (5 860 500 р.) | 1 746 р. 11 коп. (17 461 139 р.) |
| 2 | по ул. Лебедевской (в районе жилого дома №36 и №40), район индивидуальной жилой застройки «Новая жизнь» | 340100000002005824 | 0,0910 | Охранные зоны электрических сетей | | 16 147 р. 91 коп. (161 479 136 р.) | 807 р. 40 коп. (8 074 000 р.) | 2 137 р. 01 коп. (21 370 095 р.) |
| 3 | в районе улиц Механическая – Бирюзовая (район индивидуальной жилой застройки «Новая жизнь») | 340100000002005823 | 0,1158 | Охранные зоны электрических сетей | | 20 549 р. 44 коп. (205 494 352 р.) | 1 027 р. 47 коп. (10 274 718 р.) | 2 113 р. 74 коп. (21 137 436 р.) |
| 4 | район индивидуальной жилой застройки «Хутор» (участок № 64 по генплану) | 340100000007007234 | 0,0957 | Ограничений в использовании нет | | 21 781 р. 17 коп. (217 811 669 р.) | 1 089 р. 06 коп. (10 890 585 р.) | 1 941 р. 19 коп. (19 411 895 р.) |
| 5 | район индивидуальной жилой застройки «Хутор» (участок № 77 по генплану) | 340100000007005500 | 0,0706 | Ограничений в использовании нет | | 16 263 р. 39 коп. (162 633 877 р.) | 813 р. 17 коп. (8 131 695 р.) | 1 932 р. 74 коп. (19 327 395 р.) |

1. **Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).**

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.

3. **Аукцион состоится 12 октября 2016 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном кометете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые документы:

4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающие государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 8 сентября по 10 октября 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте: **www.gomel.gov.by** либо **geodezcentr.by**

■ Бабуліна навука

# БУЛЬБЯНЫ РЫТУАЛ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КОЛЬКІ сябе помніць з дзяцінства Дарынка, дык усе тыя ўспаміны цесна звязаны з бульбай. Яе вырошчванне ў сям'і, захаванне да новага ўраджаю было цэлым рытуалам, які перадаваўся з роду ў род.

Вось яна сядзіць на возе каля хлява разам з суседам па вуліцы Мікалаем Смолякам. Яна — бо малая (мусіць гадкоў з чатыры), а сусед — бо без нагі. А яшчэ таму, што ён гаспадар шэрай у яблыках кабылы. Дарынчына сям'я, дзе яна самая малодшая, уся працуе. Бацька ходка ідзе за плугам, які цягне "яблычная" кабыла. За імі ледзь паспяваюць маці разам са старэйшымі сястрой і двума братамі. Сцяпан з Мацвеем ўграбаюць гной, а маці з Анютай, з каробкамі за плячыма, ходзяць па баразне ўслед за хлопцамі і кідаюць бульбіны. Сямейка садзіць бульбу на агародзе пры хаце. Шурка — меншы з братоў, але старэйшы за Дарынку на два гады, насыпае з мяхоў у лазовыя кошыкі бульбу, якую маці з сястрой раз за разам апустошваюць у свае каробкі. Потым, у іншыя дні, прыхваткамі і ўрыўкамі бульба садзіцца на латках за межамі агарода. Яны амаль усе прылягаюць да чыгункі, бо бацька Дарынкі на ёй працуе.

Дзесьці мо праз тыдзень-другі бацька зноў бярэ ў суседа кабылу і баранue бульбяныя латкі. Гэта каб зямля была рыхлай і давала дыхаць бульбе і каб праталышыць-пазбіваць пустазелле. Праз колькі часу бульба ўсходзіць, а разам з ёю і гусценная шчотка пустой непатрэбнай зеляніны. Дарынка зноў сядзіць на нейкім латунні, але ўжо на зямлі пад яблыняй і гуляе «ў лялькі». А маці з сястрой ратуюць ад пустазелля бульбу і тут жа яе агортваюць зямлёй. Ім дапамагае Шурка — ён не саромецца «бабскай работы». Мацвей са Сцяпанам у гэты час штосьці робяць па заданні бацькі «мужчынскае».

БУЛЬБА ўсё лета расце, цвіце («буяе», так кажа маці), а потым яе бадылле ўсыхае. Гэта значыць, што бульба ўжо вырасла — паспела. Надыходзіць пара яе выкопваць. Гэта звычайна адбываецца перад школай — у канцы жніўня і першай палове верасня. Да гэтага часу да іх прыязджае баба Ганна. Яна жыве ў сына Яна, які даводзіцца Дарынцы родным дзядзькам, а яе маці малодшым братам.

**Анюта адбірае гладзенькія бульбіны на пячонікі. Калі яны прыгатаваліся, баба Ганна прымушае капальнікаў пагрэць рукі аб гарачую бульбу — каб не мерзлі зімой.**

Копка пачынаецца ў суботу. Папершае, бацька выхадны (адносна), па-другое, як кажа баба Ганна, у гэты дзень яны такім чынам ушануюць сваіх памерлых продкаў-родзічаў. Некаторых з тых «продкаў» Дарынка ведае па аповедах сваіх бацькоў і па старых фотакартках. Напрыклад, дзеда Прохара, мужа бабы Ганны, якога ні яна, ні яе сястра з братамі ніколі не бачылі — ён загінуў на вайне. А яшчэ дзеда Івана з бабай Юлькай — бацькоў яе татуся. Тыя памерлі сваёй смерцю пасля вайны. Нагараваліся і ў вайну, і пасля яе.

Працэсам кіруе бабуля, а маці Дарынкі прыслухваецца, прыглядаецца, хоць і ведае ўсе гэтыя прамудрасці з маленства. Баба Ганна наказвае капальнікам пакідаць трохі бульбы ў зямлі — каб задобрыць бульбянога бога Анчутку-бульбяніка. Каб жа Дарынцы дазволілі капаць бульбу, дык яе пра гэта не патрэбна было нават прасіць: яна гатова пакінуць для таго невядомага Анчуткі, які ўяўляецца ёй маленькім сівым дзядком з шырокай барадой і вялізнымі вусамі, усю бульбу, абы ён не галадаў. Асабліва ўзімку.

Пасля выкопвання-збірання хлопцы ладуюць-раскладваюць у канцы агарода вогнішча, а Анюта адбірае гладзенькія бульбіны на пячонікі. Калі яны прыгаталіся, баба Ганна прымушае капальнікаў пагрэць рукі аб гарачую бульбу — каб не мерзлі зімой. Гэтая працэдура вельмі падабаецца Дарынцы. Пасля грэння рук ужо можна есці-смакаваць печаную бульбу. На свежым паветры гэта такое смакоцце, якое адбіваецца ў памяці назаўсёды.

БАБА Ганна кіруе і працэдурай закладвання бульбы на зіму: у сцёбку-склеп, у капец, у хатні падпол. Дзень выбірае адзін-адзіны — той, калі памерла яе маці (панядзелак або серада). «Каб спрыяла з таго свету», — кажа, асяняючы сябе крыжам перад пачаткам абраду.

А вось закладванне капца пачынаецца задоўга да гэтага дня з паведамлення бацькі, што «заўтра зранку пасля гомельскага цягніка пройдзе вяртушка з баластам». Пасля такой навіны ад маці паступае наказ меншым сынам:

— Хлопцы, чулі, што сказаў бацька? Пасля школы — бягом да пуці. Мне патрэбны яшчэ камяньцы на кружкі для дзежак (у сцёбку з саленнямі і мачэннямі з агуркоў, капусты і яблыкаў). Не забудзьце пра капец. Хлопцы згодна ківаюць галовамі — пачулі, зразумелі.

Назаўтра Шурка з Мацвеем пасля школы бежкі кідаюць сумкі з кніжкамі, хутка абедаюць і, пераапрануўшыся ў будзённае, агародам бягуць на чыгунку. Спяшаюцца ведама чаго: аднасельцы, што жывуць уздоўж чыгуначнай калеі, першымі пасля праходу вяртушкі з баластам аказваюцца на адхонах, бо і ў іх жа ёсць патрэба ў гладкіх камянях. Аблазіўшы адхоны насыпу, падсыпанага свежым баластам, хлопцы знаходзяць гладзенькія, нібы адпаліраваныя, камяньцы рознага калібру: адны з іх пасля мыцця кладуцца на кружкі дзежак з тымі саленнямі і мачэннямі, а невялічкія, з бульбяны клубень, — у капец.

**Бабуля наказвае пакідаць трохі бульбы ў зямлі — каб задобрыць бульбянога бога Анчутку-бульбяніка.**

— Мышкі, мышкі, тачыце-вастрыце зубкі не бульбачкай, а гэтымі каменьчыкамі, — прыгаворвае баба Ганна, а следам за ёю Дарынчына маці ў той дзень, калі закладваецца на зіму капец. Ён капаецца не вельмі глыбокім (на штык рыдлёўкі), але даволі шырокім. Тут свая навука — па вясне бульбу не дастане грунтавая вада.

Для мышэй прызначаецца і балотная асака, якой укрываюць капец. Сакрэт тут таксама просты: у адрозненне ад саломы, асабліва свежай, сяліцца ў ёй мышы не любяць (у асацэ няма зерня). А гэта значыць, што бульба ў капцы застанецца да вясны цэлай і не пашкоджанай. Потым бацька з самага верху капца ўстанаўлівае «бульбяную дыхалку» — бяроставы скрутак у выглядзе трубы. Праз трубу-душнік бульба павінна дыхаць. Пасля ўсёй гэтай падрыхтоўкі хлопцы бяруцца за рыдлёўкі і закідваюць капец зямлёй. Бацечка Дарынкі завяршае ўвесь працэс — ён акуратна абгладжвае капец, раўняе яго з усіх бакоў, і той становіцца, па заключэнні бабы Ганны, "як лялька».

Капец завяршае ўвесь бульбяны рытуал.

ЗА два тыдні сям'я ўпраўляецца з уборкай бульбы, і баба Ганна збіраецца дамоў. Маці Дарынкі ладзіць ёй у адну торбу абновы (новыя кофты, спадніцы, фартухі, якія яна нашыла яшчэ задоўга да прыезду маці), у другую складвае ладныя мяшэчкі з рознымі крупамі і белай мукой. Гэтыя прадукты, якія яшчэ ў сям'і называюцца незразумелым для малой словам «дэфіцыты», атрымлівае Дарынчын бацька па спецыяльных талонах у вагоне-краме.

Выходзячы з хаты, баба Ганна асяняе яе крыжам і штосьці шэпча. Бацька з маці, з Дарынкай за рукі, вядуць-праводзяць бабулю да цягніка. Калі той даедзе да месца, яе сустрэнуць дзядзька Ян са сваімі дзецьмі.

— Мам, а мам, а што бабуля шаптала, калі выходзіла з нашай хаты? — пытаецца Дарынка па дарозе дамоў. Як ні прыслухоўвалася яна, так і не расчула ніводнага слоўца старой, і гэта не дае ёй спакою.

— А яна прасіла Госпада, каб жа ў нашай хаце заўсёды была бульба і да яе ўсё. А яшчэ, каб вы слухаліся бацьку і маці, каб глядзелі адзін аднаго, каб у нашым хляве не пераводзілася жывёла, каб мы былі жывыя і здаровыя, каб...

Дарынка, трымаючыся за рукі бацькоў, весела падскоквае паміж імі і запамінае, што кажа маці. Аказваецца, на ўсё жыццё.

**Раіса ДЗЕЙКУН, *г. Гомель.***

■ Людзі і лёсы

# НЕ ПЛЮЙ У КРЫНІЦУ

Прыгадваецца лёс адной жанчыны. Назаву яе Лідай. Адзіная дачушка ў бацькоў. Маці працавала даяркай, бацька — трактарыстам. Заробкі ў абаіх у 70-я гады былі неблагія. У хаце дастатак. Дачушка ні ў чым не мела адмовы, толькі вучыся і гуляй. І расла Ліда, не ведаючы турбот, не прывучаная да старанай працы, у атмасферы частых сварак і калатні, бо маці магла часцяком падгуляць і вярнуцца дадому апоўначы. У часы ранішніх разборак Ліда не раз чула нараканні маці на няўдачнае замужжа. Бабуля, якая жыла побач, таксама рабіла свой "унёсак" у сямейныя справы. «Магла ж выйсці за начальніка, дык не, выбрала мазутніка-трактарыста. Ты, унучачка, глядзі, не зрабі такога. Падбірай чалавека з пасадай і дастаткам. А цяпер вучыся гуляць-танцаваць, працаваць жыццё навучыць». Прывабная знешне і без браку розуму, Ліда яшчэ школьніцай палажыла вока на суседа Анатоля, які ўжо адслужыў у войску і працаваў у раёне шафёрам.

Без вялікіх намаганняў скончана школа, Ліда — студэнтка педінстытута. Праўда, праз пагрозу адлічэння за «прыкладныя» паводзіны вымушана была пасля трэцяга курса перавесціся на завочнае аддзяленне. І ўсё ж праз два гады з дыпломам на руках прынята на работу ў аддаленую школу. Сувязі з Анатолем не губляла, а ён, шчыра закахаўшыся, рэгулярна прыязджаў на спатканні. Справа блізілася да афармлення шлюбу. Жаніх купіў шлюбны вэлюм, сукенку і туфлі на высокім абцасе, белыя. У вызначаны час прымчаў на кватэру Ліды, а там... застолле грыміць!

Напярэдадні Ліда, прыпомніўшы павучанні бабулі-варажбіткі і лёс маці, завітала да маладога, яшчэ халасцяка, старшыні калгаса, які, дарэчы, удзяляў увагу сімпатычнай настаўніцы, і ўльтыматыўна запатрабавала рэгістрацыі шлюбу тэрмінова, а то будзе позна. Што было тут жа афармлена ў сельсавеце. І цяпер гулялі ці то заручыны, ці то вяселле.

Анатоль аслупянеў. А даведаўшыся, у чым справа, на вачах нешматлікіх гасцей разарваў на кавалкі шлюбны строй, а туфлі шпурнуў на стол з закускамі і са сваім сватам ірвануў з хаты.

Здавалася б, што на гэтым гісторыя няўдалага кахання Анатоля скончылася, ды Ліда не пакінула яго ў спакоі. Напэўна, і яе сэрца шчымела ад дасканай захаханасці. Яна патэлефанавала раз, другі, шкадуючы аб неабдуманым, паспешлівым учынку, тлумачачы сваю памылку, бо муж быў ёй не даспадобы: сур'ёзны, вечна заняты на працы.

У Анатоля ў грудзях кіпела і злосць, і крыўда, і боль, і пяшчота, і ён згадзіўся на сустрэчу. Ліда прыехала адведаць бацькоў, і спатканне адбылося, даўнія кантакты аднавіліся. Ды ад людзей на вёсцы не схавацца... Адна надта актыўная суседка, якая ведала ўсё і пра ўсіх, вырашыла выкрыць тайну. Аднойчы ноччу разбудзіла старшыню і паведаміла, што, напэўна, зладзеі гаспадараць у яго гаражы. Старшыня рвануў дзверы гаража, уключыў святло і здранцвеў ад убачанага. Схапіўшы манціроўку, скочыў да машыны. Ды «зладзеі», падхапіўшы адзенне, растварыліся ў начной цемры. З роспачы мужчына ўбег у кватэру, схапіў бутэльку і з рыльца, чаго не рабіў ніколі, выпіў амаль усю. Чалавек, які ніколі не садзіўся за руль, выпіўшы чарку, у такім стане не мог не ўчыніць аварыі і аказаўся ў рэанімацыі.

**Жаніх купіў шлюбны вэлюм, сукенку і туфлі на высокім абцасе, белыя. У вызначаны час прымчаў на кватэру Ліды, а там... застолле грыміць!**

Ліда, як таленавітая артыстка драмы, раскаялася ў парушэнні сужэнскай вернасці. Дабілася даравання і вяртання мужа і бацькі (ужо мелі гадавалага сыночка) у сям'ю. Змянілі месца жыхарства і працу.

Ды чалавек, паспытаўшы забароненага плода, не можа спыніцца і шукае новых прыгод. Так і Ліда. Для кар'ернага росту наладзіла цесныя стасункі з раённым начальнікам і дабілася пасады кіраўніка. Анатоль, даведаўшыся пра «кар'ерныя» сувязі каханай, адвярнуўся ўжо назаўсёды. І засталася жанчына з нялюбым мужам, які са сваім мяккім характарам, ды і не сказаць каб моцным здароўем пасля аварыі, дараваў ёй ці рабіў выгляд, што дараваў. Недарэмна мудрыя людзі казалі: «Не плюй у крыніцу — прыйдзеш па вадзіцу».

**Альфрэд ТЫЧКО, *в. Ідолта, Мёрскі раён.***

■ Куды схадзіць усёй сям'ёй

# Падарожжа па пяці акіянах,

## або У гасцях у Марліна і Пелагеі

**Вы ўжо даўно марыце акунуцца ў Атлантычны (Ціхі, Індыйскі, Паўночны Ледавіты, Паўднёвы — варыянты могуць быць розныя) акіян, каб палюбавацца на яго экзатычных жыхароў? Але пакуль нестае ні грошай, ні часу? Прапаную разам з «Сямейнай газетай» зрабіць першы крок да сваёй мары. Аказваецца, сёння да пяці акіянаў адначасова можна дакрануцца літаральна ў цэнтры Мінска.**



Дзеці прыходзяць сюды не толькі на экскурсію, але і каб незвычайна адзначыць дзень народзінаў.

**Дзе?**
г. Мінск,
вул. Брылеўская, 3.
**Калі?**
кожны дзень
з 10.00 да 18.00.

Ля ўваходу ў стылізаваную падводную лодку, што месціцца на вечнай стаянцы недалёка ад станцыі метро «Інстытут культуры», мяне сустрэў капітан-падводнік Алег ГАРБУНОЎ. Разам спускаемся ўніз па сходах і апынаемся ў адным з пяці адсекаў.



Так выглядае ўваход у міні-акіянарыум.

— Запрашаю вас прайсці праз імправізаваны Гібралтарскі праліў і выйсці ў бушуючыя воды Атлантычнага акіяна, — з усмешкай кажа спадар Алег і прапаноўвае падысці бліжэй да ілюмінатараў-акварыумаў, каб паназіраць за чароўным падводным жыццём. Каго тут толькі няма! Марскія зоркі і конікі, малюскі, медузы, больш як 140 рознакаляровых рыбак (ёсць падобныя да матылька, ластаўкі, папугайчыка, дэльфінчыка і нават рыба-жаба...).

— А вось гэта сімпатычная рыбка-певень, — паказвае Алег Гарбуноў. — Бачыце, у яе на плаўніку вочка-падманка. Драпежная рыба падумае, што гэта сапраўднае вока, схопіць за плаўнік і застанецца «з носам». Нават калі адкусіць яго, нічога страшнага: вырасце новы, як у нас з вамі валасы ці пазногці. Вось так некаторыя рыбкі выратоўваюцца.

Ёсць у міні-акіянарыуме і драпежныя рыбы. Пірання, акула-котка, бамбукавае акуляня па мянушцы Балтыка (абавязкова папрасіце, каб вам паказалі скуранае яйка, з якога яно вылупілася. Я такое бачыла ўпершыню!). Але найбольш мяне ўразіла сваім незвычайным выглядам крылатка. Яе яшчэ называюць «рыба-зебра».

— Не глядзіце, што яна такая спакойная, — заўважыў маё захапленне спадар Алег. — Гэта адзін з самых небяспечных драпежнікаў, бо на кончыку кожнага плаўнічка ёсць ядавітыя капсулы, як у скарпіёна на хвасце.

Побач з «ручной» рыбкай (пачніце вадзіць рукой па шкле акварыума — і яна будзе плаваць след за ёй) жыве пацешны аксалотль. З абодвух бакоў галавы ён мае пушыстыя нарасці, падобныя да рожак. Гэта жабры, праз якія рыбка дыхае. Што цікава, калі возера перасыхае, «рожкі» таксама высыхаюць, і аксалотль ператвараецца ў яшчарку.

У марскіх глыбінях шмат таямніц. Вось на карале сядзіць самы маленькі рак у свеце. Непадалёк радуюцца жыццю шкляныя сомікі (яны зусім празрыстыя!). А якое задавальненне назіраць за тым, як галавангія актыніі, падобныя да кветачак, сваімі шчупальцамі ядуць планктон.

Паводле слоў Алега Гарбунова, дзеткі асабліва радуюцца, калі бачаць жывых герояў сваіх любімых мульцікаў. У прыватнасці, вёрткую рыбку-клоўна яны называюць Марлін, а сіняга «хірурга» — Доры, як галоўных герояў фільма «У пошуках Нэма». Калі бачаць залатых рыбак (тут іх два віды — вуаляхвост і чырвоны каптурык), загадваюць жаданні.

— Знаёмцеся, гэтую кайманавую чарапаху завуць Пелагея, — кажа спадар Алег. — Ёй усяго толькі 7 гадоў, але важыць яна звыш 25 кілаграмаў. Жыве чарапаха больш за 100 гадоў. Гэта вельмі драпежны від. Паглядзіце на гэтыя магутныя заднія лапы з кіпцюрамі, як у мядзведзя.



Рыба-зебра.

Яна адштурхоўваецца імі ад дна неглыбокага вадаёма, выскоквае з вады і хапае нават вадаплаўных птушак. Зважце, замест зубоў у Пелагеі дзюба. Укус яе мацнейшы, чым у кракадзіла.

Мяне ж больш за ўсё ўразілі іншыя дзве чарапахі. Аўстралійская з доўгай шыяй і далёкаўсходні мяккацелы трыёнікс. Першая мае доўгую, выгнутую шыю. Калі кладзецца спаць, яна яе абарочвае вакол панцыра, бо цалкам не можа ўцягнуць у сябе. Другая чарапашка мае плоскі носік, з-за чаго атрымала мянушку Пятачок. Што цікава, яна мае мяккі, як пластылін, панцыр, таму можа лёгка пралазіць нават праз невялікія адтуліны.

— А дзе гіганцкі краб Пятровіч, які два гады таму прадказваў выніку матчаў чэмпіянату свету па хакеі? — цікаўлюся.

— Ён рыхтуецца да новага праекта. У верасні мы плануем запусціць перасоўны музей у выглядзе падводнай лодкі Карла Шыльдара *(ураджэнец Віцебскай губерні, які ў 1834-м стварыў падводную металічную лодку. —* **Аўт.).** Акрамя Пятровіча, там будзе робат-метэаролаг і яшчэ шмат чаго цікавага. Таму сачыце за навінамі на нашым сайце http://ocean-minsk.by і абавязкова прыходзьце.

Падчас падарожжа па пяці акіянах я ўбачыла мангавае дрэва, якое расце ў салёнай вадзе, бівень маржа, зуб маманцяняці, пазванок кіта, мінашукальнік 1943 года (менавіта з такім Жак-Іў Кусто пачынаў шукаць метал пад вадой), першы акваланг... Прымерала сапраўдны вадалазны скафандр і бесказырку. Пагладзіла чырванавухіх чарапашак і папугая, названага ў гонар Рабінзона Круза...

— Да нас прыходзяць бацькі з дзеткамі не толькі на экскурсіі, але і каб незвычайна адзначыць дзень народзінаў, — кажа Алег Гарбуноў. — Запрашаем аніматара, які па марской тэматыцы праводзіць з імі інтэрактыўныя гульні, па пірацкай карце яны тут шукаюць скарбы. У выніку дзеці не толькі добра бавяць час, але і даведваюцца шмат новага: запамінаюць, колькі ў нас на планеце акіянаў, знаёмяцца з багатым падводным светам. Многія пасля экскурсіі далучаюцца да Дзіцячага навуковага акіянаграфічнага таварыства, што працуе пры нашым цэнтры акіянаграфіі «Адкрыты акіян». Для самых актыўных і кемлівых ладзім міжнародныя марскія экспедыцыі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*
**Фота з архіва цэнтра акіянаграфіі**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**П А К А Ш Т У Й Ц Е !**

## САЛАТА «ЧЫРВОНАЕ МОРА»



***Спатрэбіцца:*** *крабавыя палачкі або крабавае мяса — 200 г, цвёрды сыр — 150 г, памідоры — 3 шт., часнок — 2 зубкі, маянэз.*

Сыр надзіраем на буйной тарцы. Крабавыя палачкі або мяса наразаем тонкай саломкай.

Часнок здрабняем. Памідоры рэжам на долькі. Сярэдзіну вымаем, увесь сок і зярняты ў страву не ідуць. Наразаем памідоры таксама саломкай. Злучаем усе інгрэдыенты.

Змешваем. Але запраўляць адразу не будзем. Гэта салата значна смачнейшая, калі заправіць яе перад самай падачай.

Як варыянт можна дабавіць яшчэ чырвоны балгарскі перац.

Дарэчы, салату можна запраўляць як сумессю смятаны з маянэзам, так і адной смятанай.

## МЯСНЫЯ КЛУБОЧКІ

***Спатрэбіцца:*** *300 г слоенага бездражджавога цеста, 2 вялікія цыбуліны, 500 г мяснога фаршу, 2 ст. л. аўсяных шматкоў, 1 невялікі чырвоны балгарскі перац, 1 цэлае яйка, 2 яечныя жаўткі, 2 ст. л. масла, сумесь перцаў, соль.*



Цыбулю і балгарскі перац ачысціць і здрабніць. Дабавіць да фаршу. Добра змяшаць. Туды ж убіць яйка, дадаць аўсяныя шматкі, перац, пасаліць. Старанна вымесіць фарш. Даць яму настаяцца на працягу 20-30 хвілін. Падзяліць фарш на прыкладна роўныя порцыі — большыя, чым фрыкадэлькі, але меншыя, чым катлеты. Раскачаць цеста, разрэзаць нажом на 25 вузкіх палосачак. Кожны кавалачак фаршу скачаць у шарык. Абкруціць яго палоскай цеста, намотваючы, як ніткі на клубок. Прамазаць бляху распушчаным маслам. Выкласці клубочкі.

Аддзяліць жаўткі ад бялкоў. У жаўткі дабавіць крыху халоднай вады або малака і ўзбіць відэльцам. Гэтай сумессю шчодра прамазаць клубочкі.

Выпякаць у духоўцы пры 200 °С хвілін 30.

## ХАТНІ МАЯНЭЗ З ТВАРАГУ

***Спатрэбіцца:*** *3 ст. л. з горкай абястлушчанага тварагу, 3 ст. л. кефіру, 2 вараныя жаўткі, 5 кропель лімоннага соку, 0,5 ч. л. гарчыцы, у тры пальцы чорнага молатага перцу, 0,25 ч. л. солі.*

Вараныя яйкі пачысціць і дастаць з іх жаўткі. Бялкі не спатрэбяцца. Злучыць тварог і жаўткі. Лепш за ўсё пры дапамозе блендара ператварыць іх у крэмападобную масу.

Падліць кефір, накапаць лімоннага соку, дабавіць соль, перац, гарчыцу і цукар.

Яшчэ раз як след узбіць. Колькасць гарчыцы і лімоннага соку можна адрэгуляваць на свой смак.

**В А Р Т А  В Е Д А Ц Ь**

## ПРАДУКТЫ, ЯКІЯ МОЖНА ЗАМАРОЗІЦЬ

**1. Бліны з начынкай.** Можна прыгатаваць больш апетытных бліноў, а затым проста разаграваць іх на сняданак у мікрахвалёўцы або на патэльні.

**2. Рыс.** Замарожаны рыс гатуецца значна хутчэй, асабліва такая хітрасць спатрэбіцца пры варцы карычневага рысу.

**3. Яблычны пірог.** Аказваецца, можна замарозіць не толькі цеста, але і пірог з начынкай. Абгарніце нарыхтоўку пекарскай паперай, а затым змясціце ў пакет. Выпякайце пірог, не размарожваючы, пры тэмпературы 150 градусаў.

**4. Кукуруза.** Замарозьце некалькі пачаткаў проста ў лісці: яны дапамогуць захаваць смак маладых і свежых зярнят.

**5. Таматны соус.** Пасту з памідораў можна не толькі кансерваваць у слоіках, але і замарожваць. Патушыце на працягу некалькіх гадзін здробненыя таматы з дабаўленнем спецый і алею, а затым размяркуйце па формачках і адпраўце ў маразілку.

**6. Бульбяное пюрэ.** З рэштак бульбяной кашы атрымліваюцца апетытныя катлеткі. Але калі вам сёння не despадабы такая страва, а выкідаць гарнір шкада, скарыстайцеся наступнай хітрасцю.



З дапамогай лыжкі для марожанага сфармуйце з пюрэ шарыкі, выкладзіце на паднос, замарозьце, а затым складзіце ў пакет. Захоўвацца ў такім выглядзе пюрэ можа да 3 месяцаў.

**7. Малако.** Часта малако выкарыстоўваецца не цалкам і кісне. Каб не выліваць каштоўны прадукт, пераліце яшчэ добрае малако ў бутэльку, пакінуўшы яе на трацiну пустой, і змясціце ёмістасць у лядоўню.

**8. Сок.** Гэтак жа, як і малако, можна замарожваць сок, не запаўняючы ёмістасць цалкам.

**9. Сезонныя гародніна і садавіна.** Ягады замарожваюць цалкам, гародніну і буйную садавіну наражце на кубікі або надзярыце на тарцы. Лепш спачатку замарозіць гародніну паасобку, а потым змяшаць неабходнае асарці ў пакеце.

**10. Вострыя прыправы і зяленіва.** Завялы пучок кропу, пятрушкі або базіліку дробна наражце, змяшайце з алеем і пакладзіце ў формачкі для лёду. Духмяная запраўка гатова!

*«ЧАЛАВЕК НІКОЛІ НЕ ПАВІНЕН ГРЭБАВАЦЬ СВАЁЙ СЯМ'ЁЙ ДЗЕЛЯ БІЗНЕСУ»* *(Уолт Дысней, заснавальнік кампаніі Walt Disney Productions).*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# Віктар ВАРАНЕЦ: «БЕЛАРУСКАЯ МОВА ВАРТАЯ ТАГО, КАБ ЯЕ ДАСКАНАЛА ВЕДАЦЬ!»

## ПРА ЛІТАРАТУРНЫЯ ЗАХАПЛЕННІ, НАШЫ СПРАДВЕЧНЫЯ МЕДЫЦЫНСКІЯ ТЭРМІНЫ І АРГУМЕНТЫ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСКАМОЎНАГА СКЕПТЫЦЫЗМУ

**Напярэдадні Дня беларускага пісьменства мы сустрэліся з намеснікам дэкана медыка-псіхалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, з чытачом і аўтарам «Звязды» Віктарам ВАРАНЦОМ і распачалі гутарку з віншаванняў літаратурнаму клубу «Катарсіс», якім ён кіруе, з нагоды перамогі ў рэспубліканскім конкурсе літаратурнай творчасці студэнтаў устаноў адукацыі.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

### ХОБІ МЕДЫКАЎ — ЛІТАРАТУРА

— Наш клуб створаны ў 1999 годзе. Студэнты пішуць вершы, апавяданні, п'есы. Ніхто не ставіць задачу стаць прафесійным пісьменнікам, але, як той казаў, у кожнага медыка павінна быць хобі. І вось у нашых студэнтаў гэтае хобі літаратурнае. Выпусцілі ўжо тры калектыўныя зборнікі, у кожным з якіх каля 40 аўтараў. А 4 гады таму вырашылі прыняць удзел у фестывалі студэнцкай моладзі «Арт-вакацыі», у рамках якога праводзіцца конкурс літаратурнай творчасці «Аўтограф». Калі мы ўпершыню ў ім удзельнічалі, то атрымалі дыпломы першай ступені ў намінацыях «Проза», «Паэзія» і трэцяе месца ў намінацыі «Відэафільмы». А сёлета — ужо 5 дыпломаў першай, другой і трэцяй ступеняў і ў цэлым клуб узнагародзілі дыпломам 1-й ступені за літаратурныя дасягненні. Не пабаюся сказаць, на сённа нашы паэты і празаікі ў Беларусі ў ліку наймацнейшых сярод студэнтаў у літаратурным напрамку.

> **«Калі мова падмацавана яшчэ адпаведнай прафесійнай лексікай, то гэта гаворыць пра яе трываласць, гістарычную моц».**

Клуб праводзіць адкрытыя літаратурныя конкурсы. Спачатку іх ладзілі ўнутры ўніверсітэта, потым — у рамках горада, а сёлета ён атрымаўся агульнарэспубліканскім. Удзельнічалі не толькі студэнты нашай ВНУ, але і навучэнцы ліцэяў, каледжаў, людзі, якія ўжо працуюць. Канкурсантаў было больш за 40 чалавек, прычым не толькі з Гродна, але і з Мінска, Брэста, Магілёва, Ваўкавыска, Бярозы...

У нас, здавалася б, ёсць літаратурныя саюзы, але, па вялікім рахунку, з аматарамі ніхто не працуе. А ім жа хочацца ўдасканальвацца, сустракацца, атрымліваць нейкія парады. Таму ўсе ўдзельнікі конкурсу прасілі арганізаваць віртуальны клуб у рамках Беларусі, каб можна было хаця б праз інтэрнэт адно з адным размаўляць, раіцца, вучыцца.

***— Сталыя чытачы «Звязды» ведаюць вас як аўтара газеты і пераможцу нашага конкурсу апавяданняў. Што сёння ў творчым багажы?***

— Я ніколі не ставіў за мэту стаць прафесійным літаратарам: для мяне гэта, як і для студэнтаў з клуба «Катарсіс», таксама хобі. Калісьці больш звяртаў увагу на паэзію, выпусціў зборнік «Рамеснік», спрабаваў пісаць і гумарыстычныя апавяданні, і гістарычнага кірунку. Нядаўна закончыў пісаць дэтэктыў. Адзінае, што ўсё гэта аб'ядноўвае, — тэма Гродна. Наш горад багаты на гісторыю, розныя таямніцы, легенды, паданні. І мне цікава дакранацца да гэтай тэмы ў розных літаратурных жанрах. Цяпер спрабую напісаць п'есу пра аднаго з гарадзенскіх князёў. Бог ведае, што атрымаецца...

### ПАЧАЛОСЯ З КАРАТКЕВІЧА

***— Вы ўжо шмат гадоў працуеце ў беларускамоўнай лінгвістыцы. Як зацікавіліся?***

— Нарадзіўся я ў Гродне і памятаю, што ў 1970-х гадах шмат хто крышку з пагардай ставіўся да беларускай мовы. Маўляў, вясковая мова... Але неяк яшчэ школьнікам пабываў у турыстычнай паездцы ў Літве і ўпершыню задумаўся: чаму літоўцы гавораць на літоўскай мове, рускія — на рускай, а беларусы на беларускай не размаўляюць? Гэтая думка неадчэпна была са мной. А апошняй кропляй, якая схіліла на беларускую мову, стала тое, што ў 9 класе я натрапіў на аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Прачытаўшы, зразумеў, што беларускую мову трэба ведаць дасканала, бо такія творы можна чытаць толькі на мове арыгінала. І гэта вырашыла мой далейшы лёс, пасля чаго, не раздумваючы, паступіў на філалагічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы. Пасля заканчэння ВНУ працаваў настаўнікам у вясковай школе, у гарадской гімназіі і ўжо больш за 20 гадоў — у медыцынскім універсітэце.

***— Гродзенскі медуніверсітэт быў першапраходцам у выкладанні беларускай мовы ў няпрофільных ВНУ...***

— На той час, у 1992 годзе, беларуская мова ў няпрофільных ВНУ не выкладалася, нават у Мінску. У нашым універсітэце гэтым заняліся дзякуючы першаму прарэктару Уладзіміру Сямёнавічу Васільеву. Ён лічыў, што беларускую мову павінны ведаць усе. А на той час было шмат дзяцей вайскоўцаў, чыноўнікаў, якія ў школе былі вызвалены ад беларускай мовы. І вось, ужо студэнтамі, яны ўзяліся яе вывучаць. А паралельна распачалася праца ў галіне медыцынскай лексікі. У 1995 годзе мы ўжо ўвялі асобны прадмет «Беларуская мова. Прафесійная лексіка».

Заўсёды цікава рабіць нешта ўпершыню. Пісаць новыя падручнікі, праграмы — яно хоць і складана, але цікава, зацягвае. І ты атрымліваеш асалоду ад таго, што робіш і бачыш вынікі.

***— Але, мяркуючы па вашых артыкулах наконт выкладання беларускай мовы ў няпрофільных ВНУ, на гэтым шляху хапала і праблем...***

— Быў перыяд, калі пачалі скарачаць блок сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, да якіх тады адносілася беларуская мова. І сапраўды стаяла пытанне зняць гэты прадмет з няпрофільных універсітэтаў. Памятаю, напісаў тады артыкул у «Звязду». Дзякуй газеце, яго надрукавалі і гэта быў першы штуршок — праблему падтрымалі Таварыства беларускай мовы, грамадскасць, ды і самі студэнты пісалі лісты наконт неабходнасці выкладання беларускай мовы. Агульнымі намаганнямі ўдалося пераканаць Міністэрства адукацыі, што гэты прадмет патрэбен. І як вынік — прадмет «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» трывала замацаваўся ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях. Скажам, у нашым універсітэце ён уваходзіць у блок абавязковых дысцыплін, і, думаю, так будзе і далей.

***— Гэтыя пазіцыі ўмацоўваюцца?***

— Зараз праблема «трэба ці не трэба» ўвогуле не стаіць. Пытанне: што рабіць у рамках гэтага прадмета? Як яго ўдасканаліць? У прыватнасці, неабходна ўнармаваць прафесійную тэрміналогію. Сёння ў медыцынскіх універсітэтах вучацца і па слоўніку, які працэнтаў на 70 складзены з новатвораў, і па слоўніку, дзе працэнтаў 90 — калькі з рускай мовы, а хтосьці і па слоўніку Варанца, дзе спрадвечная беларуская лексіка займае 50 працэнтаў. Такога разнабою быць не павінна. На мой погляд, па ініцыятыве Міністэрства адукацыі неабходна стварыць адпаведную заканадаўчую базу па ўнармаванні прафесійнай лексікі, каб яна ўсюды аднолькава выкладалася і выкарыстоўвалася.

### «ДЛЯ МЯНЕ АДКРЫЎСЯ ВЯЛІЗНЫ ЛЕКСІЧНЫ ПЛАСТ»

***— Чаму доктару важна ведаць беларускую мову?***

— Медыцына, як ніводная іншая галіна жыцця нашых грамадзян, можа паспрыяць зацікаўленасці беларускай мовай. Практычна ўсе мы звяртаемся да лекараў. І калі доктар ведае беларускую мову, то гэта крышку падштурхоўвае і пацыента размаўляць па-беларуску, а не ламаць, як бывае, асабліва з вясковымі людзьмі, мову, якая ім блізкая. Тады, дарэчы, атрымліваецца больш давяральны дыялог паміж урачом і пацыентам. І ў нас ёсць медыкі, якія свабодна размаўляюць па-беларуску.

***— Працуючы над тэмай беларускамоўнай медыцынскай тэрміналогіі, што было для вас самым нечаканым?***

— Для мяне ўвогуле ўсё было адкрыццём. Я лічыў, што беларуская мова ў медыцыне абмяжоўваецца колам у 40—50 слоў. А калі пачаў займацца глыбей, падымаць увесь лексічны пласт, убачыў, што такіх слоў больш за 2 тысячы. Гэта быў сапраўдны шок. Галоўнае, нейкае прыемнае здзіўленне і адчуванне гонару за нашу мову. Таму што калі мова падмацавана яшчэ адпаведнай прафесійнай лексікай, то гэта гаворыць пра яе трываласць, гістарычную моц. Наяўнасць вялізнага пласта медыцынскай тэрміналогіі на беларускай мове прымусіла мяне скрупулёзна заняцца гэтым пытаннем. І я заўсёды знаёмым кажу: «Людцы, гэта ж не толькі ў медыцыне. Капніце лексіку па любой іншай спецыяльнасці і ўбачыце, што беларусы — людзі з вялікай гістарычнай спадчынай. Стапрацэнтна ёсць тэрміны і па іншых галінах».

> **«У цябе напісана, што і па-руску, і па-беларуску «аборт». А вось у бальніцы заўсёды казалі «спарон». Высветлілася, што сёння значная колькасць акушэраў-гінеколагаў, нават рускамоўных, паміж сабой выкарыстоўваюць гэтае слова.**

Калі людзям, тым жа студэнтам, якія скептычна ставяцца да нацыянальнай мовы, пачынаеш паказваць, што ў нас ёсць ад чаго адштурхоўвацца, чым ганарыцца, то скептыцызм адразу знікае. Пачынаюць цікавіцца: «Няўжо? А можна прывесці нейкія прыклады?» Чаму нельга? Будзеце не толькі ведаць асобныя прыклады, але і грунтоўна гэтую тэму вывучаць.

### БРЭНДАВЫ ЗНАК

— У апошнія гады заўважаю такі зрух, асабліва на старшых курсах, калі беларуская мова становіцца як брэндавы знак. Для часткі маладых людзей размаўляць на ёй прэстыжна (кажучы маладзёжным слэнгам, крута). Шмат пра што сведчаць і вынікі анкетавання, якое мы рэгулярна праводзім сярод студэнтаў. Тое, што 100% станоўча ставяцца да беларускай мовы — гэта адназначна. Але тое, што каля паловы хочуць размаўляць па-беларуску — пра гэта гадоў 10 назад можна было толькі марыць.

Разам з тым пакуль не ўдалося стварыць беларускамоўную групу, больш за чатырох ахвотнікаў на адным факультэце сабраць не можам. Агітуем абітурыентаў, выкладчыкі прайшлі падрыхтоўку, каб выкладаць спецыяльныя дысцыпліны на беларускай мове. Аднак студэнты асцерагаюцца: «А што будзе «на выхадзе»? Хто са мной у бальніцы будзе размаўляць па-беларуску?»

Але некалькі гадоў назад была і такая ініцыятыва з боку студэнтаў, калі яны стварылі гурток, каб удасканаліць сваю беларускую мову, і мы з імі на 5-6 курсах факультатыўна займаліся. Яны практычна гатовыя штодзённа гаварыць па-беларуску.

> **«Каля паловы хочуць размаўляць па-беларуску — пра гэта гадоў 10 таму можна было толькі марыць».**

Дарэчы, беларускай мовай вельмі цікавяцца і замежныя студэнты. У арабаў ёсць нават нейкая фанетычная блізкасць да нашай мовы. Яны даволі хутка ёй авалодваюць, і калі ўдзельнічаюць ва ўніверсітэцкіх конкурсах мастацкай самадзейнасці, то абавязкова рыхтуюць нейкі нумар на беларускай мове. Па-беларуску спяваюць, ставяць сцэнкі. Нават былі выпадкі, калі замежныя студэнты прасілі мяне крышку пазаймацца з імі беларускай мовай.

***— А ці паўплывалі бацькавы работы ў беларускамоўным кірунку на маладога ўрача Арцёма Варанца?***

— Безумоўна. Беларуская мова з дзяцінства вакол яго лунала, і таму ён заўсёды падтрымліваў беларускамоўную плынь. І цэнтралізаванае тэсціраванне здаваў па-беларуску, і перад студэнтамі на многіх канферэнцыях на беларускай мове выступаў. Цяпер паехаў па размеркаванні ў Бераставіцу, адпрацаваў тры тыдні і кажа: «Знайшоў тут беларускую мову». Калі пацыент пачынае гаварыць па-беларуску, то і ён арганічна пераходзіць на родную мову. Тады яму, псіхіятру-нарколагу, лягчэй наладзіць зносіны з пацыентам. Думаю, беларускую мову Арцём ужо не страціць.

***— Як у медыцынскім асяроддзі ўспрынялі з'яўленне руска-беларускага тлумачальнага слоўніка медыцынскіх тэрмінаў?***

— Спачатку гэта было здзіўленне. Аказваецца, ёсць у прыродзе беларускія медыцынскія тэрміны, і іх багата! Але яшчэ больш здзівіліся, калі даведаліся, што сёння часам імі карыстаюцца. Напрыклад, падышоў да мяне дэкан педыятрычнага факультэта Андрэй Леанідавіч Гурын і кажа: «У цябе напісана, што і па-руску, і па-беларуску «аборт». А вось у бальніцы заўсёды казалі «спарон». Сапраўды, ёсць такі беларускі тэрмін. Але я спачатку палічыў яго ўстарэлым, даўно забытым. А потым, калі пагаварыў і з іншымі людзьмі, высветлілася, што сёння значная колькасць акушэраў-гінеколагаў, нават рускамоўных, паміж сабой выкарыстоўваюць гэтае слова «спарон». Адпаведна ўвёў яго ў слоўнік. І такіх слоў дастаткова. Разумееце, калі гэта наватвор, то людзі ставяцца да яго крышачку насцярожана: мала хто што выдумае... Але ў Беларусі вялікі тэрміналагічны пласт, які быў спрадвеку.

Дарэчы, неўзабаве ў нашым універсітэцкім выдавецтве павінен выйсці «Дыялектны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў». Ён, улічваючы частотнасць ужывання тых ці іншых слоў у рэгіёнах Беларусі, дапаможа даказаць, што тэрміны выкарыстоўваліся не нейкім тэрытарыяльна абмежаваным колам, а значнай колькасцю людзей.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
prakopchik@zviazda.by

**Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by**

# РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе

# ПО ПРОДАЖЕ АПАРТАМЕНТОВ И ГАРАЖНЫХ БОКСОВ в г. Сочи,

## находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, росс. руб. | Задаток, росс. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 001 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 101,2 кв.м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот № 2 | Апартамент № 002 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 59,7 кв.м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот № 3 | Апартамент № 003 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 61,2 кв.м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот № 4 | Апартамент № 004 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 99,6 кв.м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот № 5 | Апартамент № 101 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 101,7 кв.м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот № 6 | Апартамент № 104 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 100,8 кв.м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот № 7 | Апартамент № 201 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 8 | Апартамент № 202 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв.м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот № 9 | Апартамент № 203 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв.м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот № 10 | Апартамент № 204 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв.м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот № 11 | Апартамент № 205 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв.м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот № 12 | Апартамент № 206 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв.м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот № 13 | Апартамент № 208 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 14 | Апартамент № 209 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв.м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот № 15 | Апартамент № 210 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 16 | Апартамент № 211 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот № 17 | Апартамент № 301 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв.м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот № 18 | Апартамент № 302 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв.м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот № 19 | Апартамент № 303 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв.м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот № 20 | Апартамент № 305 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот № 21 | Апартамент № 306 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот № 22 | Апартамент № 308 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот № 23 | Апартамент № 309 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот № 24 | Апартамент № 310 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв.м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот № 25 | Апартамент № 311 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв.м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
